Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
30 КРАСАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 81 (29450)
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TVПРАГРАМА



ВЯРТАННЕ СВЯТЫНІ 4



«МЫ ВЕРЫЛІ, І МАЛЫШ ВЫЖЫЎ!» 21

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас з Першамаем.*

*Сёння мы славім людзей працы, адзначаем поспехі найлепшых прадпрыемстваў, калектываў, асобных цэхаў і брыгад, ушаноўваем ветэранаў. Беражом гэтую традыцыю як даніну павагі пакаленням, што здзяйснялі працоўныя подзвігі на карысць Айчыны. Працягваем пачаты імі адзіна правільны і правераны часам шлях да росквіту роднай зямлі і дабрабыту народа. Шлях штодзённай працы — карпатлівай, сумленнай і стваральнай.*

*За апошнюю чвэрць стагоддзя мы шмат чаго дасягнулі: навялі парадак на зямлі, зрабілі выдатныя дарогі, захавалі і мадэрнізавалі вытворчасці, узвялі ўласную атамную станцыю. Пабудавалі чыстую, утульную, камфортную краіну.*

*Перакананы, што разам, аб'яднаўшы творчыя намаганні, працавітасць, волю і інтэлект, мы зможам супрацьстаяць любым выклікам і пагрозам, вырашыць усе задачы сучаснага парадку дня.*

*Шчыра жадаю беларусам мірнага неба, здароўя, шчасця і новых прафесійных здзяйсненняў.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Праца заўжды ў пашане



Фота БелТА.

# Свята веры, жыцця і справядлівасці



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***Праваслаўным хрысціянам Беларусі***

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас са Светлым Уваскрэсеннем Хрыстовым.*

*Вялікдзень для ўсяго хрысціянскага свету — сімвал трыумфу веры, жыцця і справядлівасці.*

*З году ў год у гэтыя радасныя дні ствараецца адмысловы настрой надыходзячага цуду. Мы пераацэньваем свае ўчынкі, дзелімся цяплом міласэрнасці з людзьмі вакол нас, клапоцімся пра тых, хто апынуўся ў складанай сітуацыі.*

*Шмат стагоддзяў праваслаўныя традыцыі сілкуюць душу беларускага народа збаўчымі ісцінамі хрысціянства, дапамагаюць захаваць нашы бясцэнныя скарбы: любоў да роднай зямлі, талерантнасць, мудрасць і сілу адзінства.*

*Няхай незвычайны духоўны ўздым гэтага свята дапаможа нам у добрых справах, прынясе ў кожны дом мір, згоду і шчасце.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Месцічы

# У ВЯСКОЎЦАЎ ВЫХАДНЫХ НЯМА

У сельгаспрадпрыемстве «Мурава» завяршылі пасяўную, работа на палях і фермах працягваецца

**Напярэдадні Першамая мы накіраваліся ў Мураву, бо дзе яшчэ гаварыць пра свята працы, як не ў сельгаспрадпрыемстве. Дакладней, на вытворчасці, якая не мае выхадных альбо святочных вакацый наогул. Жывёлагадоўчыя комплексы функцыянуюць кожны дзень аднолькава. Ды і земляробы працуюць не ад кампаніі да кампаніі. Пасяўная фактычна завершана, але кожны дзень можа прынесці сюрпрызы, абумоўленыя надвор'ем, шкоднымі насякомымі, хваробамі раслін, — і заўсёды трэба быць гатовым выйсці ў поле.**

СТАР. 5





Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ISSN 1990 — 763X
21081
9 771990 763008

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Так званая дыктатура і парадак паказалі сваю эфектыўнасць»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па сітуацыі ў сферы аграпрамысловага комплексу краіны: аб бягучым стане спраў, праблемных пытаннях і шляхах іх вырашэння

**Калі для многіх сфер эканомікі 2020 год быў выпрабаваннем, то для сельскай гаспадаркі ён склаўся добра. Вытворчасць валавой прадукцыі ў АПК павялічылася амаль на пяць працэнтаў. Пры гэтым прырост назіраўся ва ўсіх абласцях краіны. Намалочана больш збожжа, павышана ўраджайнасць з гектара і сярэднія надоі. Таму і выручка ад рэалізацыі на 14 працэнтаў пайшла ўверх. Задачы на бягучы год вызначаны — павялічыць вытворчасць ва ўсіх катэгорыях на 2,7 працэнта. У тым ліку і ў сельскагаспадарчых арганізацыях на 3,5 працэнта. Ці ўдасца сялянам захаваць узяты тэмп і выйсці на запатрабаваныя паказчыкі, абмяркоўвалі ўчора падчас нарады. Акрамя гэтага, на парадку дня былі тэмы, ускосна звязаныя з АПК, — меліярацыя, вырашэнне лёсу закінутых сядзіб і фермаў.**

Паводле слоў Прэзідэнта, у кантэксце пандэміі пытанне харчовай бяспекі выйшла на адно з першых месцаў. «Мінулай вясной у свеце былі ледзь не панічныя настроі: не ведалі, як пасеяць і вырасціць ураджай. Прадказвалі дэфіцыт прадуктаў харчавання. Так яно і адбылося ў свеце. Сёння рост цэн на прадукты харчавання перавысіў 10 працэнтаў па ўсёй планеце. ***Менавіта ў гэты момант так званая дыктатура і парадак, за якія нас не проста падкрытыкоўваюць, а папракаюць, паказалі сваю эфектыўнасць»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Дзякуючы таму патэнцыялу, які стварылі за перыяд незалежнасці ў сельскагаспадарчай галіне, у мінулым годзе забяспечаны рост вытворчасці асноўных відаў прадукцыі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Разам з тым інфармацыя кантралюючых органаў аб актуальным стане спраў у жывёлагадоўлі некалькі насцярожвае. Зніжана вытворчасць жывёлы і птушкі ў жывой вазе. Няхай крыху, але зніжана. Пры гэтым вырас падзёж, скарацілася пагалоўе. Я думаю, генеральны пракурор добра ведае, што гэта зона адказнасці пракуратуры. Мы пра гэта дамовіліся яшчэ паўтара года таму. Падзёж недапушчальны, калі мы хочам, каб сельскагаспадарчая вытворчасць расла», — адзначыў кіраўнік краіны.

Ён акцэнтаваў увагу, што ў чарнобыльскіх рэгіёнах, калі старшыні райвыканкамаў не спраўляюцца з праблемай, маладняк з іх гаспадарак павінен быць адпраўлены ў тыя, што могуць забяспечыць нагляд. «Гэта не толькі тэхналагічныя пытанні, якія профільныя спецыялісты павінны загадзя планаваць і вырашаць. Ад вытворчасці залежаць рэалізацыя прадукцыі і, як вынік, эканамічны стан вёскі, які цяпер не самы просты. Па грошы нават не звяртайцеся. Грошы — у вас. Нам, дай бог, вырашыць тыя задачы, праблемы і планы, што мы намецілі. ***Мы не можам дазволіць сабе папаўняць грашовыя страты нічым, акрамя эфектыўнай вытворчасці»,*** — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, у адсутнасці дысцыпліны і арганізацыі ўся праблема, у гэтым упэўніўся на мінулым тыдні, абляцеўшы паўкраіны. Ён папрасіў далажыць старшынь аблвыканкамаў аб прычынах, якія сталі перашкодай развіцця аграпрамысловага комплексу, і, галоўнае аб тым, якія прымаюцца меры для іх ліквідацыі. ***«Сельскагаспадарчая галіна спецыфічная тым, што менавіта на месцах (а не ў Мінску) знаходзяцца ключавыя фактары поспеху — эфектыўнае выкарыстанне матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, выключэнне фактаў безгаспадарчасці, аптымальнае задзейнічанне ўсяго патэнцыялу галіны.*** Пры гэтым мы дамаўляліся, што старшыні райвыканкамаў, аблвыканкамаў — гэта ваша зона адказнасці. Але функцыі павінны быць размеркаваны паміж выканкамамі раённых саветаў і абласных саветаў, міністэрствамі і ўрадам», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым трэба ведаць, перакананы кіраўнік краіны, што асноўная задача віцэ-прэм'ера, які адказвае за ўвесь АПК, — экспарт прадукцыі. Што датычыцца ўрада, то ён «павінен забяспечыць па-буйному сельскую гаспадарку, лічы, пасяўную і ўборачную: фінансавыя рэсурсы, матэрыяльна-тэхнічную базу, маю на ўвазе, паліва перадусім, угнаенні. І больш туды не трэба лезці», абазначыў задачы Прэзідэнт. На губернатараў жа ўскладзена выбудоўванне стратэгіі АПК, а на старшынь раённых выканкамаў — яе рэалізацыя. «Губернатары, назірайце, каб была эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці, каб тэхналогіі захоўваліся. Гэта і міністра сельскай гаспадаркі задача — тэхналогіі, самыя перадавыя. І пуга ў вас павінна быць у руках, калі дзесьці нешта не так, але не ўмешваючыся ў вытворчы працэс. Паўтараюся, што мы з вамі пра гэта дамовіліся. Вы вызначыце, хто за што адказвае, але галоўнае — вынік», — нагадаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, павінны быць прыняты рашэнні, якія вызначаць канкрэтныя задачы для кіраўнікоў усіх узроўняў, і ўстаноўлены параметры, па якіх пасля будзе дадзена ацэнка вынікаў працы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што настойвае на актывізацыі меліярацыі любымі сродкамі і за любыя грошы. Усё павінна быць накіравана на гэта, у тым ліку і ініцыятыва людзей, бо страчваюцца тысячы гектараў, зарастаючы хмызняком. ***«Меліярацыя, утрыманне земляў, павышэнне ўрадлівасці (гумус і іншае) — гэта задача дзяржаўнай важнасці.*** Гэта наша задача. Таму я папрашу міністра і віцэ-прэм'ера заняцца гэтымі праблемамі. У кожным раёне, яшчэ раз паўтараю, павінны быць спецыяльныя атрады, якія будуць гэтым займацца, — сказаў Прэзідэнт. — ***Меліярацыя — пытанне найважнейшае для нас. У кожнай вобласці шырокім фронтам павінна ажыццяўляцца меліярацыя.*** Таму што нават у Генадзя Міхайлавіча (Салаўя. — **«Зв.»**) у чарнобыльскіх абласцях людзі радуюцца, калі ў сотню гектараў нейкае поле далучаюць. Чаму? Бо трэба кармы атрымаць, каб у жывёлаводстве дадаць».

Ён заўважыў, што ў плане меліярацыі асабліва «сумна выглядае» тэрыторыя паміж Мінскам і Барысавам.

Яшчэ адна праблема, якая кідаецца ў вочы, па словах Прэзідэнта, — пустыя прысядзібныя ўчасткі і дамы. Па працягу года задача ўсёй вертыкалі ўлады ад кіраўніка краіны — іх прадаць ці знесці.

«Старыя з'ехалі, памерлі, а дзецям не патрэбныя. Але ў нас добры працэс пайшоў — гараджане пачалі такія дамы купляць, нават у самых аддаленых вёсках. ***Ваша задача — усе гэтыя дамы ці знесці, ці прадаць за капейкі, калі патрэбна. Але галоўнае для вас — апрацаваць гэтыя прысядзібныя ўчасткі»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У звязцы з гэтай і наступная праблема. Будоўля жывёлаводчых комплексаў дала магчымасць сысці са старых вытворчых пляцовак. «Мы кінулі старыя фермы, і на дахах растуць дрэвы. Мужыкі, два-тры гады — усё прыбраць ці закапаць на месцы, вельмі глыбока, каб не перашкаджала араць. Захочуць людзі разабраць, нешта забраць, няхай забіраюць, але парадак трэба навесці», — дадаў кіраўнік краіны.

Старшыню Камітэта дзяржкантролю Васіля Герасімава Аляксандр Лукашэнка папрасіў узяць усе пералічаныя праблемы на кантроль. Па яго словах, кожны тыдзень яму прадстаўляюць справаздачу аб ходзе вясенне-палявых работ. «Пакуль адстаём. І скажу вам шчыра: працуйце суткі — як хочаце. З сённяшняга дня надвор'е ўсталявалася. ***Да 9 мая мы павінны ў асноўным пасеяць і буракі, і лён, і кукурузу, і палову бульбы.*** Застанецца толькі пасля 9 мая дасеяць бульбу. Сплануйце справу і пакажыце, што вы можаце арганізаваць працэс, — даручае Прэзідэнт. — Папрасіце гараджан, арганізуйце, каб дапамаглі, дзе трэба. Але толькі там, дзе трэба, не вазіце аўтобусамі людзей дзеля паказухі. 9 мая — кантрольная кропка, 10-га я знайду час, каб паглядзець краіну і зрабіць выснову, на што здольныя губернатары і падначаленыя ім людзі».

**Марыя ДАДАЛКА.**

### • Каментарый у тэму

**Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра**, у размове з журналістамі адзначыў: «Аграрная галіна — адна з самых няпростых і шматгранных, там заўсёды ёсць нюансы і пытанні. Як паказвае жыццё, яна становіцца адной з самых тэхналагічных, таму такія нарады з падвядзеннем прамежкавых вынікаў і наразаннем задач сталі неабходнасцю і традыцыяй». Па яго словах, прысутнасць на сустрэчы губернатараў надала актыўнасць нарадзе, бо кожны ўзнімаў праблемы свайго рэгіёна, і некаторыя са складаных выклікаў удалося вырашыць.

**Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінскага аблвыканкама,** паведаміў, што вобласці пастаўлена задача за бягучую пяцігодку навесці парадак са стратнымі гаспадаркамі, дзе традыцыйныя метады аздараўлення не працуюць. Такіх на Міншчыне каля 60. «Для кожнай гаспадаркі — індывідуальнае рашэнне. Няма агульных падыходаў. Я Прэзідэнта запрасіў у Крупскі раён для таго, каб далажыць пра нашы падыходы. Крупскі раён — адзін з прыкладаў такіх падыходаў у вобласці», — дадаў старшыня Мінскага аблвыканкама.

**Яго калега з Гродзенскай вобласці Уладзімір КАРАНІК** задаўся рытарычным пытаннем, чаму ў адных гаспадарак атрымліваецца зарабляць «на зямлі», а іншыя не спраўляюцца са стратамі. «Сёння ў нас ёсць такія раёны, як Гродзенскі, дзе няма ніводнага стратнага прадпрыемства. Там кожнае мае значныя сумы на дэпазітах. Але ёсць раёны, дзе назіраюцца праблемы з развіццём. Сёння абмяркоўваўся падыход — для кожнай гаспадаркі выпрацоўваць індывідуальную стратэгію. Мы спадзяёмся, што на працягу гэтага года будуць вызначаны крыніцы фінансавання мерапрыемства па паскораным развіцці, і мы будзем бачыць вынік», — заявіў старшыня Гродзенскага аблвыканкама.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Байдэн прадставіў пакет стымулаў на $1,8 трлн



Прэзідэнт ЗША падчас выступлення ў Кангрэсе прадставіў новы пакет стымулаў агульным аб'ёмам $1,8 трыльёна. Прапановы Байдэна прадугледжваюць выдаткі ў памеры $1 трлн на працягу 10 гадоў, а таксама падатковыя льготы на агульную суму $800 млрд. Прапановы датычацца адукацыйных праграм, а таксама сацыяльнага забеспячэння сем'яў з нізкім або сярэднім прыбыткамі. Сродкі для аплаты сацыяльных праграм адміністрацыя разлічвае прыцягнуць за кошт павышэння стаўкі падаходнага падатку для заможных амерыканцаў з 37 % да 39,6 %. Акрамя таго, прэзідэнт прапануе падняць падатак на даход з прыросту капіталу і дывідэндаў для людзей, якія зарабляюць ад $1 млн, амаль удвая: з 20 % да 39,6 %. З улікам дзеючай надбаўкі да падатку на прыбытак ад інвестыцый у 3,8-працэнтнага пункта стаўка падатку для багатых амерыканцаў дасягне 43,4 % (цяпер яна складае 23,8 %). План Байдэна таксама ўключае зніжэнне падаткаў для людзей з нізкім і сярэднім прыбыткамі.

## Прэзідэнт Малдавіі распусціла парламент




Мая Санд прызначыла датэрміновыя выбары на 11 ліпеня. Пра гэта яна паведаміла на спецыяльным брыфінгу. Указ прэзідэнта падпісаны пасля рашэння Канстытуцыйнага суда, які ануляваў рэжым надзвычайнага становішча, уведзены з 1 красавіка па 31 мая. У гэты перыяд распускаць парламент па законе было нельга. Раней судовая інстанцыя канстатавала наяўнасць умоў для роспуску цяперашняга складу парламента, які двойчы не здолеў зацвердзіць склад урада пасля адстаўкі Іона Кіку з пасады прэм'ера ў снежні мінулага года. Лідар найбуйнейшай у Малдавіі партыі сацыялістаў, былы прэзідэнт Ігар Дадон, заклікаў левыя партыі аб'яднацца на парламенцкіх выбарах, якія адбудуцца 11 ліпеня.

## Кітай вывеў на арбіту базавы модуль арбітальнай станцыі



Цяжкая ракета-носьбіт «Чанчжэн-5B» паспяхова вывела на нізкую калязямную арбіту базавы модуль «Цяньхэ» будучай кітайскай арбітальнай станцыі. Аб гэтым паведаміла Кітайскае нацыянальнае касмічнае ўпраўленне. Запуск ракеты з базавым модулем станцыі быў ажыццёўлены з касмадрома Вэньчан на востраве Хайнань. Вывад на арбіту вышынёй 370 кіламетраў асноўнага модуля (вагой 22,5 тоны і аб'ёмам 50 куб. метраў) з цэнтрам кіравання, жылым адсекам і шлюзам з'яўляецца першым этапам стварэння арбітальнай станцыі. Усяго для завяршэння яе будаўніцтва спатрэбіцца 11 запускаў і крыху больш за год. На арбіту вывядуць два лабараторныя модулі, якія будуць прыстыкаваныя да базавага модуля. Будуць запушчаны чатыры грузавыя і чатыры пілатуемыя караблі. Мяркуецца, што ўжо ў маі да станцыі адправіцца грузавы карабель «Цяньчжоў-2», а ў чэрвені паляціць пілатуемы «Шэньчжоў-12» з трыма тайканаўтамі (кітайскімі касманаўтамі) на борце для зборкі і падключэння абсталявання.

Парламенцкі дзённік

# АБАРОНА ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І ПРАВА БЫЦЬ АДЗІНЫМ НАРОДАМ

**«Надышла неабходнасць у фарміраванні аб'ектыўнай нацыянальнай гістарычнай палітыкі». Гэтыя словы старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ сталі лейтматывам на парламенцкіх слуханнях «Тэрытарыяльная цэласнасць і народнае адзінства Беларусі. Гісторыка-прававыя аспекты аднаўлення заходнебеларускіх земляў у складзе БССР». Ініцыятарам дыскусіі выступіла Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы.**


Фота БелТА.

## «Існуюць межы, перасякаць якія не дазволена нікому»

«Цяперашнія парламенцкія слуханні з'яўляюцца працягам той велізарнай сістэмнай работы, якую мы вядзём у рамках Саюзнай дзяржавы, АДКБ, СНД па абароне гістарычнай праўды і захаванні гістарычнай памяці, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка ў сваім выступленні. — На жаль, светапоглядные супрацьстаянне, у аснове якога — спробы рэвізіі вынікаў Другой сусветнай вайны, набывае сапраўды планетарныя маштабы. І Беларусь, якая знаходзіцца на геапалітычным разломе Усходу і Захаду, зноў апынулася ў эпіцэнтры гэтага канфлікту».

У такой сітуацыі дыскусіі, здавалася б, чыста акадэмічнага характару, нясуць цалкам рэальную пагрозу нашай нацыянальнай бяспецы, лічыць кіраўнік парламента. «Бо ад таго, як грамадства ставіцца да свайго мінулага, наўпрост залежыць захаванне народнага адзінства і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы.

Асаблівую значнасць тут набываюць ключавыя моманты гісторыі. Для Беларусі і беларусаў адной з такіх падзей, безумоўна, з'яўляецца ўз'яднанне заходнебеларускіх земляў у складзе БССР», — сказаў ён.

Мэта парламенцкіх слуханняў — паглядзець на гэтую падзею вачыма беларусаў, расставіць палітычныя акцэнты зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

«Грамадзяне павінны разумець, што адбываецца вакол Беларусі і для чаго гэта робіцца. Мы ніколі раней не выносілі падобныя пытанні на такі ўзровень, каб не закранаць нацыянальныя пачуцці нашых суседзяў. Але, на жаль, гэта ўспрымаецца як слабасць, няздольнасць адстаяць свае інтарэсы і толькі падганяе пэўныя сілы, якія імкнуцца раскалоць беларускае грамадства», — дадаў ён.

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, некаторыя замежныя палітычныя сілы разглядаюць Беларусь як перашкоду ў рэалізацыі сваіх геапалітычных планаў, таму спрабуюць перафарматаваць гістарычную памяць беларусаў і ўнушыць ім комплекс нацыянальнай непаўнавартасці.

«Разлік просты: народ, у якога не сфарміравана калектыўная памяць, асуджаны на страту ідэнтычнасці, а значыць, і права самастойна вызначаць свой лёс, — пракаментаваў парламентарый. — Ім хочацца, каб мы забыліся на трагедыю Рыжскага дагавора, што разрывала Беларусь па-жываму, палітыку паланізацыі беларускага народа, зверскія злачынствы так званых праклятых салдат у дачыненні да беларускага насельніцтва. У той жа час адмаўленне гістарычнай справядлівасці, якім, безумоўна, стала ўз'яднанне беларускіх земляў, падаецца як нейкі акт агрэсіі».

Падобныя трактоўкі для беларусаў непрымальныя, падкрэсліў дэпутат: «Беларусы выпакутавалі сваё суверэннае права быць адзіным народам і жыць у адзінай дзяржаве. Памятаць пра гэта — наш святы абавязак».

Беларусь адбылася як моцная незалежная дзяржава менавіта дзякуючы таму, што ў аснову палітычнага курсу, прапанаванага Прэзідэнтам, былі закладзены ідэі гістарычнай пераемнасці і сацыяльнай справядлівасці, упэўнены спікер.

«Мы захавалі ўсё лепшае, што нам дасталося ў спадчыну ад ранейшых гістарычных эпох, і значна нарасцілі свой эканамічны, тэхналагічны і інтэлектуальны патэнцыял, — сказаў ён. — Сёння Рэспубліка Беларусь — развітая еўрапейская дзяржава, якая ў стане за сябе пастаяць. І цяперашнія парламенцкія слуханні — выразны сігнал усім аматарам спекуляваць на гістарычнай праблематыцы».

Існуюць межы, перасякаць якія не дазволена нікому, падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. «Перагляду гісторыі, гераізацыі нацыстаў і іх памагатых, апраўдання экстрэмізму і рэваншызму ў Беларусі не будзе. Гэта наша прынцыповая, жорсткая пазіцыя», — паўтарыў ён.

Шэраг крокаў у гэтым кірунку дэпутатамі ўжо распачаты, перш за ўсё, у заканадаўчай сферы, заўважыў старшыня Палаты прадстаўнікоў і заклікаў такую ж прынцыповую пазіцыю займаць і ў дыскусіях, якія вядуцца на міжнародных парламенцкіх пляцоўках.

## Памяць дзеля гонару

Разам з тым Уладзімір Андрэйчанка перасцярог ад атаясамлівання асобных замежных палітыкаў і палітычных сіл з цэлымі краінамі і народамі. «Наша задача — не фарміраванне вобразу ворага, а абарона гістарычнай праўды, — сказаў ён. — Тым больш што ў нашай гісторыі ёсць маса прыкладаў, якія аб'ядноўваюць народы і з'яўляюцца прадметам агульнага гонару». Глыбока перакананы, што менавіта іх мы павінны ставіць у аснову, калі звяртаемся да мінулага».

Спікер прывёў такія прыклады і ў беларуска-польскай гісторыі: у 1943 годзе першая польская пяхотная дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі прыняла сваё баявое хрышчэнне менавіта на беларускай зямлі, беларусы і палякі разам прайшлі цяжкімі дарогамі вайны, вызвалялі Беларусь, Польшчу, штурмавалі Берлін. Краіны звязвалі, па словах старшыні, трывалыя вытворчыя, адукацыйныя, культурныя сувязі і ў пасляваенныя гады.

«На гэтым фоне асабліва недарэчнымі выглядаюць спробы раздуць у нас так званае польскае пытанне, — дадаў ён. — Беларусы, руская, палякі, яўрэі, украінцы, літоўцы спакон веку жывуць на гэтай зямлі як у вялікай сям'і, якая не падзяляе сваіх дзяцей на родных і прыёмных. І з гэтага пункту гледжання яны ўсе з'яўляюцца беларусамі».

Мы нікому не пагражаем, не маем тэрытарыяльных прэтэнзій, падкрэсліў парламентарый. «Адзінае наша імкненне — гэта захаваць незалежнасць Беларусі, зрабіць краіну ўтульнай, камфортнай як для нашых грамадзян, так і для ўсіх, хто прыязджае да нас з адкрытым сэрцам, з гатоўнасцю да супрацоўніцтва. І ніхто, акрамя саміх беларусаў, гэтага не зробіць, — заявіў кіраўнік парламента. — Сёння нам як ніколі патрэбныя грамадская салідарнасць, адзінства ўлады і народа, шчыры патрыятызм і пачуццё гонару за гісторыю краіны і яе дасягненні. У гэтым — залог будучыні Беларусі».

Уладзімір Андрэйчанка параіў больш актыўна культываваць пазітыўны вобраз айчыннай гісторыі, дамагацца, каб яна стала рэальным здабыткам кожнай беларускай сям'і, кожнага беларуса.

«Задача маштабная, і вырашыць яе толькі намаганнямі дзяржавы практычна немагчыма. Неабходны дзейны ўдзел у гэтай рабоце ўсіх структур грамадзянскай супольнасці, пошук нефармальных шляхоў захавання сувязі пакаленняў, перадачы гістарычнага вопыту. І тут вялікае поле дзейнасці для парламентарыяў, якія могуць дапамагчы канвертаваць розныя грамадзянскія ініцыятывы ў рэальныя справы на карысць Беларусі», — рэзюмаваў ён.

Шырокія магчымасці для гэтага даюць мерапрыемствы, якія праводзяцца ў краіне ў кантэксце Года народнага адзінства і 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны, нагадаў спікер.

«Цалкам відавочна, што надышла неабходнасць у фарміраванні аб'ектыўнай нацыянальнай гістарычнай палітыкі, каштоўнасным ядром якой з'яўляецца ідэя аб'яднання і стварэння», — падсумаваў ён.

## Свята і помнік

На супадзенне ўгодкаў сумнай для беларусаў падзеі — 100 гадоў Рыжскага дагавора — і аб'яўлення 2021 года Годам народнага адзінства звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК.**

«Яшчэ адзін важны момант: на ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы, не толькі ў нас, зараз адбываюцца так званыя войны за гісторыю, калі многія факты, каб дагадзіць той або іншай палітычнай кан'юнктуры, скажаюцца. Таму тэма слуханняў набывае надзвычайную актуальнасць», — сказаў ён.

**Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь кандыдат гістарычных навук Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ** у сваю чаргу падкрэсліў, што падзеі, якія адбыліся на тэрыторыі Беларусі ўвосень 1939 года, насельніцтва Заходняй Беларусі ўспрымала менавіта як акт гістарычнай справядлівасці.

Пры гэтым, дадаў гісторык, Народны сход, які адбыўся той восенню ў Беластоку, прадставіў фактычна ўсе нацыянальнасці, розныя сацыяльныя групы, якія жылі ў той час на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Выбары дэлегатаў, па яго словах, былі вельмі масавымі і праходзілі на значна больш дэмакратычных падставах, чым мела выбарчае польскае заканадаўства ў міжваенны час.

«Таму гэта, калі хочаце, быў усенародны плебісцыт, вынікам якога стала ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, — сказаў рэктар. — Цікава, што на Народным сходзе ў Беластоку было прынятае рашэнне аб'явіць 17 верасня Днём уз'яднання беларускага народа і ўстанавіць помнік змагарам за свабоду беларусаў. На жаль, рашэнне не было рэалізаванае, але, думаю, сёння надышоў час гэта зрабіць. Гэта вельмі знакавая падзея — наш народ уз'яднаўся ў рамках адной дзяржавы, а гэта — аснова паспяховага развіцця для любога народа і для любой дзяржавы».

У абмеркаванні падзей, якія адбыліся больш за 80 гадоў таму, іх значнасці для дня сённяшняга, акрамя дэпутатаў, узялі ўдзел першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, міністр адукацыі Ігар Карпенка, намеснік Генеральнага пракурора Аляксей Стук, члены Савета Рэспублікі, намеснікі кіраўнікоў рэгіёнаў, прадстаўнікі іншых грамадскіх органаў, вучоныя, прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў і грамадскіх арганізацый.

Выступоўцы казалі пра міжнародныя і геапалітычныя наступствы аб'яднання беларускага народа, гісторыю беларуска-польскіх адносін, шляхі ўдасканалення заканадаўства па захаванні гістарычнай спадчыны. Па выніках дыскусіі былі прыняты рэкамендацыі для міністэрстваў адукацыі, інфармацыі і культуры, Белтэлерадыёкампаніі, Нацыянальнай акадэміі навук. Яны датычацца школьнай праграмы, інфармацыйнай кампаніі, навуковай работы і стварэння прысвечанага падзеям 1939 года мемарыяла.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

Запрашальнік

# ПРА АДЗІНСТВА — НА МОВЕ ТВОРЧАСЦІ

**НАН Беларусі абвяшчае рэспубліканскі конкурс творчых работ, прысвечаны Году народнага адзінства.**

Конкурс пройдзе ў наступных намінацыях: «Песні нашага краю», «Вершы і апавяданні пра свой край», «Краязнаўчымі сцежкамі», «Мова маёй зямлі (мясцовыя народныя гаворкі, геаграфічныя назвы, асабовыя імёны)», «Выяўленчае мастацтва», «Фота- і відэавідарысы», «Творы народных майстроў».

Да ўдзелу запрашаюцца творчыя людзі, аматары і прафесіяналы (вучоныя, пісьменнікі, журналісты, мастакі, кампазітары, скульптары, фотамайстры, майстры народных рамёстваў), а таксама настаўнікі, вучнёўская і студэнцкая моладзь: усе, у чыіх творах увасоблены ідэі народнага адзінства, сацыяльнай згоды і грамадскага паразумення.

Лаўрэаты кожнай намінацыі будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі знакамі-сімваламі конкурсу.

Заяўкі прымаюцца да 1 кастрычніка 2021 года па электроннай пошце skaryna2017@gmail.com, а таксама на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СВЯТЛО Ў КОЖНЫМ СЭРЦЫ



**Пасхальнае пасланне мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, архіпастырам, свяшчэннаслужыцелям, манахам і ўсім верным дзецям Беларускай Праваслаўнай Царквы**

*Той, хто пабаяўся смерці, перамог і адолеў смерць, бо Ён, Бог наш, успрыняў пакутлівую адушаўлёную плоць і, уступіўшы ў барацьбу з мучыцелем, усіх з Сабою ўваскрасіў, бо Ён праславіўся.*

Трапар 1-й песні ўваскрэснага канона, Актоіх, глас 3.

**Узлюбленыя ў Хрысце высокашаноўныя архіпастыры, пачэсныя айцы, богалюбівыя інакі і інакіні, дарагія браты і сёстры!**

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Гэты святочны вокліч, прамоўлены святымі апосталамі і жанчынамі-міраносіцамі, якія даведаліся пра ўваскрасенне свайго Настаўніка і Госпада Ісуса Хрыста, і цяпер напаўняе нашы сэрцы благагавеннем і радасцю, як бы часта мы яго ні паўтаралі. Разам са свяціцелем Кірылам Тураўскім мы ў пасхальнай радасці звяртаемся да Спасіцеля нашага: «Учора з разбойнікам мы распіналіся разам з Табою, а сёння ўваскрэслі разам з Табою! ... Учора з Нікадзімам з Крыжа здымалі Цябе, а сёння з Магдалінай бачым Цябе ўваскрэслага; учора з Іосіфам клалі Цябе ў магілу, а сёння падобна таму, як быццам Марыя, чуем ад Цябе радасныя словы: «Ідзіце, абвясціце братам Маім, каб пайшлі ў Галілею; і там яны ўбачаць Мяне» (Мф. 28:10).

Прападобны Амвросій Опцінскі заклікае нас «належным чынам зразумець значэнне свята Пасхі Хрыстовай і належным чынам яго святкаваць». З гэтай мэтай звернемся да зямнога служэння Спасіцеля, якое з першых дзён ішло да Распяцця і Ўваскрасення. Тры з паловай года падзяляла Хрышчэнне ў Іардане ад Галгофы, але ў гэты нядоўгі перыяд кожны ўздых Свой, кожнае слова і ўчынак Госпадзь цалкам прысвячаў справе выкуплення чалавечага роду, і для нашага спасення паказаў Ён столькі чалавекалюбства.

Святыя айцы называюць Хрыста другім Адамам, Які прыйшоў на зямлю, каб выправіць тое, што было разбурана першым. Аднак паслухмянасць Хрыста Свайму Айцу патрабавала большых намаганняў, чым выкананне запаведзяў, якіх павінен быў прытрымлівацца Адам.

Сын Божы ва ўсім суаднесіў Сваю чалавечую волю з воляй Айца Нябеснага. Неаднаразова Ён сведчыў аб сваім чаканні, калі, узнесены на Крыж, Ён зможа сказаць: «Здзейснілася!» Але і на Галгофу Ён узыходзіць толькі тады, калі ўсе зямныя ўмовы Яго подзвігу былі выкананы, і калі на Крыж, паводле слова свяціцеля Філарэта (Драздова), Яго паклікала любоў Айца, паклікала на распяцце.

Ісус Хрыстос па чалавецтву меў страх пакут і смерці, але пераадолеў прыродную немач дзеля паслухмянасці Айцу Нябеснаму і спасення людзей ад граху, вечнай смерці і праклцяця: «упакорыў Сябе і быў паслухмяны нават да смерці, і смерці крыжовай» (Флп. 2:8), паказаўшы вялікі прыклад для ўсіх Сваіх паслядоўнікаў.

Падзеі, якія папярэднічалі Уваскрасенню, з аднаго боку, паказваюць нам, што зрабіў грэх з чалавечай прыродай, бо не было на зямлі граху больш страшнага, чым забойства Сына Божага. Але, з іншага боку, менавіта гэты самы нізкі ўзровень падзення чалавека і найвышэйшы трыумф ворага роду чалавечага становяцца пераломным момантам зямной гісторыі. Перамога адбываецца дзякуючы спасіцельнаму подзвігу Богачалавека, Яго пакутам і ўваскрасенню і адкрывае нам бясконцыя перспектывы духоўна-маральнага ўдасканалення і яднання з Богам. Уваскрэснуць з Хрыстом змогуць усе, хто кіруюцца Яго вучэннем, вобразам думак і паводзін.

Жыццё і подзвіг Спасіцеля — ідэал для ўсіх часоў і для ўсіх народаў. Гэты ідэал адлюстраваны ў Евангеллях, якія неабходна кожнаму хрысціяніну чытаць і кіравацца імі ў сваім паўсядзённым жыцці. Паводле слова прамудрага Саламона, «захоўванне законаў... — залог неўміручасці» (Прам. 6:18). Адно з самых вялікіх няшчасцяў сучаснага чалавека ў тым, што вывучэнне законаў, якія вядуць да правільнага і гарманічнага зямнога жыцця, якое прыводзіць да жыцця вечнага, — пакінута ім і забыта.

Гармонія ў асобнай чалавечай душы і разам з тым добрыя змены ў грамадскім жыцці магчымы тады, калі кожны з нас будзе ўзгадняць сваю волю з воляй Божаю і інтарэсамі другіх людзей. У прападобнага Авы Дарафея ёсць дзівосны вобраз, які тлумачыць гэтую ісціну. Свет — гэта круг, у цэнтры якога Бог. Праменні, накіраваныя да цэнтра, — гэта шляхі жыцця чалавечага. Чым бліжэй мы да цэнтра, чым больш адкрываем сэрца для Бога, тым становімся бліжэй адно да аднаго.

Дарагія ў Госпадзе браты і сёстры! Віншую Вас з Уваскрасеннем Хрыстовым і жадаю, каб кожнае сэрца прасвяцілася святлом Хрыстовага вучэння, каб усе нашы ўчынкі трымаліся закона Божай любові. Праз малітву Хрысту Уваскрэсламу няхай мы ўбачым шлях добрага абнаўлення, які прывядзе нас да згоды і адзінства ў нашых сем'ях, працоўных калектывах, ва ўсім нашым грамадстве. Малітоўна жадаю вам душэўнага і цялеснага здароўя і дапамогі Божай на ўсіх шляхах вашага жыцця. Няхай зберажэ Госпадзь нашу краіну і няхай прасвяціць кожнага з нас Сваёю ісцінаю і праўдаю!

Хрыстос Уваскрэс!

Сапраўды Уваскрэс!

**ВЕНІЯМІН,**
**мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,**
**кіраўнік Барысаўскай епархіі.**

*Пасха Хрыстова, 2021,*
*горад Мінск.*

# Да свята Вялікадня — з Тураўскім крыжам



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Хутка праваслаўны Вялікдзень...**
**І зноў загучаць у многіх сэрцах словы беларускага «Залатавуста», святога Кірылы Тураўскага: «Цяпер нябёсы прасвятліліся, цёмныя аблокі, нібы старыя шаты, скінуўшы, і светлым паветрам славу Гасподнюю спавядаюць».**
**Але да такога свята нельга прыйсці з пустым сэрцам — толькі з вынікам духоўнай працы. Кірыла Тураўскі прыпадабняў нас да працы пчолаў, якія, «узлятаючы, мядовыя соты ствараюць, каб людзям слодычы і царкве карысць надаць».**
**Згадаем у гэтыя перадсвяточныя дні важны духоўны праект, здзейсненне якога асвятляла «Звязда», непасрэдна звязаны з імем святога Кірылы, епіскапа Тураўскага, — аднаўленне напрастольнага крыжа Тураўскага епіскапальнага храма.**
**Шмат гадоў гэта заставалася марай вядомага гісторыка Пятра Лысенкі, які яшчэ ў 1960-х знайшоў падчас раскопак у Тураве чатыры свінцовыя абразкі — Найсвяцейшай Багародзіцы і трох святых і выказаў гіпотэзу, што яны, магчыма, з напрастольнага крыжа кафедральнага сабора Турава, у 1230 годзе разбуранага землятрусам.**
**У 2018 годзе быў аб'яўлены конкурс на найлепшы эскіз крыжа, 26 верасня мінулага года крыж прадстаўлены народу, а на пачатку гэтага года група, якая працавала над праектам узнаўлення, атрымала прэмію «За духоўнае адраджэнне».**

*— Літаральна за апошні месяц прыйшло адчуванне, што Тураўскі крыж ужо заняў сваё месца ў сэрцах беларусаў,* — кажа адна з узнагароджаных, **аўтар канцэпцыі крыжа, куратар праекта, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры, старшыня Сінадальнага аддзела па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі Беларускай праваслаўнай царквы Марыя НЕЦВЯТАЕВА.** — Пасля таго як крыж быў прадстаўлены, людзі маглі з ім пазнаёміцца ў Царкоўна-гістарычным музеі. Я бачыла, як расла цікавасць да крыжа. Спачатку былі дзве-тры экскурсіі на тыдзень, а апошнія тыдні праходзілі дзесяць—дванаццаць экскурсій ад пяці да шасцідзесяці чалавек. І ў кожнай групе сустракаліся людзі, якія здзіўляліся, якое значнае месца меў Тураў у часы Кіеўскай Русі. Свяціцель Кірыл Тураўскі ў Слове аб знішчэнні Хрыстовага цела з Крыжа піша: «Бо, як і ланцугі златыя, унізанымі жэмчугам, з каштоўнымі каменнямі, радуюць вочы тых, хто глядзіць на іх, — тым вышэй духоўная нам прыгажосць, святы святыя, што цешаць сэрцы вернікаў і асвячаюць душы». І гэтыя словы нашага беларускага Залатавуста жылі ў маім сэрцы падчас працы над крыжам. Веліч сярэднявечнага і старажытнарускага Тураўскага княства хацелася паказаць у гэтым крыжы, і ўжо зразумела, што нам гэта ўдалося. Зараз дапрацоўваецца канцэпцыя стаўратэкі, у якой будзе захоўвацца крыж, і яе стварэнне — праца не аднаго года.

***— Было зроблена два асобнікі Тураўскага крыжа. Дзе яны знаходзяцца?***

— Асобнік Тураўскага крыжа, у які мітрапаліт Філарэт уклаў кавалачак крыжа Гасподня, будзе сустракаць гэту Пасху ўжо ў Тураве, а ў дзень памяці свяціцеля Кірылы Тураўскага, 11 мая, у крыж будуць укладзены астатнія святыні. Сімвалічна, што сёлета дзень памяці свяціцеля Кірылы Тураўскага супаў з Радаўніцай, калі царква моліцца аб усіх, хто сышоў ад нас, аб продках. Царква ўказвае на неабходнасць такой малітвы. На нашых землях яшчэ было шмат традыцый па ўшанаванні продкаў, напрыклад, пакідаць на магілах ручнікі і суканкі для вандроўнікаў ці ўдоў з сіротамі, каб тыя, з-за сваёй беднасці, маглі ўзяць рэч і памаліцца аб нябожчыку. Вось і мы прыносім крыж да тураўскіх свяціцеляў, каб яны памаліліся аб роднай зямлі, і кожны, хто будзе прыязджаць у Тураў, захоча больш даведацца аб веліччы Тураўскага княства. Другі асобнік знаходзіцца ў музеі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе з ім можа пазнаёміцца кожны жыхар і госць беларускай сталіцы.

***— Тураўскі крыж — гэта і духоўная рэліквія, і твор мастацтва... І з аднаго, і з іншага боку, маглі быць і яшчэ будуць, відаць, розныя ацэнкі і заўвагі... Як вы лічыце, ці маюць рацыю тыя, хто лічыць гэты артэфакт творам менавіта сучаснага беларускага мастацтва, амажам, рэплікай на гіпатэтычны старажытны прадмет?***

— Тураўскі крыж — гэта, безумоўна, і твор сучаснага беларускага мастацтва, і ўзноўлены старажытны прадмет. Работы па ўзнаўленні не робяць галоўным форму, як падчас рэканструкцыі ці рэстаўрацыі, — узнаўленне гістарычных прадметаў неабходна для захавання гістарычнай памяці і традыцый. Такія работы заўсёды ідуць з прыстаўкай «магло б быць». Але пры гэтым трэба было рабіць крыж і зразумелым для сучаснага чалавека. Напрыклад, святога князя Андрэя Багалюбскага мы падпісалі «Багалюбаў». У летапісах ён называецца «суждальскім» ці «богалюбивым» (тым, хто любіць Бога). Мы выкарысталі сапраўдны дзеепрыметнік прошлага часу ад «любіць Бога».

Кожны крок у рабоце з крыжам для мяне стаў адкрыццём роднай Беларусі і нашага адметнага самастойнага шляху. Для мяне да гэтага часу незразумела, чаму мы ўсе баімся паглядзець на сваю спадчыну. Кожны дзень праваслаўныя вернікі моляцца словамі нашага першадрукара Францыска Скарыны. Менавіта яго Малая падарожная кніга стала асновай для сучаснага праваслаўнага малітваслова. Але мы не ведаем малітвы, напісаныя свяціцелем Кірылам Тураўскім. Нібыта азіраемся па баках і пытаемся, а ці можна карыстацца нашай спадчынай. Адкрыўшы любы артыкул па старажытным Мінску, мы чытаем, што першая царква на замчышчы не была дабудавана. Але як жа можна было не накрыць царкву дахам і пры гэтым пакласці на падлогу дарагую маёлікавую плітку? Любы будаўнік скажа, што гэта немагчыма. Мы нібыта не прызнаём за сабой права мець гістарычную адметнасць. Але кожны год нам яе паказвае: вось прападобная Ефрасіння Полацкая прыдумала архітэктурны «какошнік», а вось кетаўрас у старажытным храме, а вось царкоўныя тэксты аб Яўсевіі Лаўрышаўскім... Свяціцель Кірылы Тураўскі пакінуў нам небывалую для свайго часу спадчыну. Ёсць яго асабістыя тэксты, есць тэксты, падпісаныя ім, але няма спецкурса па творах свяціцеля Кірыла Тураўскага ў беларускіх духоўных школах, няма выдання яго спадчыны ў беларускіх царкоўных крамах. За апошнія дваццаць гадоў мы шмат даведаліся аб прападобнай Ефрасінні Полацкай, і, спадзяюся, што Тураўскі крыж стане штуршком для прац па даследаванні нашага беларускага Залатавуста.

***— Яшчэ адзін важны духоўны праект, які нядаўна здзейсніўся з вашым удзелам, — адкрыццё мемарыяльнага кабінета Уладыкі Філарэта.***

— Работу над мемарыяльным кабінетам мы пачалі некалькі гадоў таму, калі пачаўся рамонт у епархіяльным упраўленні. З настаяцелем храма свяціцеля Кірылы Тураўскага айцом Уладзімірам Даўгаполавым мы звярнуліся да мітрапаліта Паўла, і ён падтрымаў задумку перанесці ў мемарыяльны кабінет мэблю, стол і крэсла мітрапаліта Філарэта. Мы хацелі адкрыць мемарыяльны кабінет мітрапаліта яшчэ год таму, пры яго жыцці і прымеркаваць да 85-годдзя. Спачатку перанеслі на снежань, на дзень анёла. Але ўсё неяк не атрымлівалася... 12 студзеня Уладыка памёр. Было прынята рашэнне афіцыйна адкрываць мемарыяльны кабінет на дзень нараджэння мітрапаліта Філарэта — 21 сакавіка. Адкрыццё прайшло так добра і па-дамашняму... Мне падабаецца вечарам, пасля работы, калі трэба нешта зрабіць па музеі, рабіць гэта за сталом мітрапаліта Філарэта. Я ціхенька стаўлю крэсла насупраць яго крэсла і працую з паперамі.

***— Чым адметны створаны мемарыяльны кабінет?***

— Рэчы і ўзнагароды мітрапаліта Філарэта былі перададзены яшчэ асабіста ім пры стварэнні музея ў 2013 годзе. Крэсла, на якім сядзеў мітрапаліт Філарэт за працай у епархіяльным упраўленні, яму засталося ад мітрапаліта Антонія (Мельнікава), на стале шмат яго уласных рэчаў: рукапісныя дакументы, штодзённік, акуляры.

***— Як трапіць у кабінет?***

— Для наведвання Царкоўна-гістарычнага музея трэба напісаць ці патэлефанаваць мне, і мы дамовімся аб часе наведвання (+375 29 3185 100, Марыя Нецвятаева). Праводзім экскурсіі і для дзяцей, і для дарослых. Экскурсія можа ўключаць наведванне толькі мемарыяльнага кабінета мітрапаліта Філарэта, а можа і экскурсію па зале, прысвечанай царкоўнаму мастацтву, а таксама па храме свяціцеля Кірылы Тураўскага. Зараз ідуць работы па рэканструкцыі залы, прысвечанай гісторыі праваслаўнай царквы ў XX стагодзі — ідзе дапрацоўка канцэпцыі. Білетаў няма — гэта асветніцкі праект, і ўсе грошы, якія ахвяруюцца, ідуць на развіццё музея.

**Лідзія ПЯТРОВА.**

# У вяскоўцаў выхадных няма



Механізатар Мікалай БУЛЬЧУК.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А забяспечваюць названыя працэсы сельскія працаўнікі, пра якіх **дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ** гаворыць з нязменнай павагай: «На службу сучаснаму аграрыю прыйшлі новыя тэхніка і тэхналогіі. Работа патрабуе значна менш, чым раней, чалавечай сілы: усё робяць машыны і трактары; высокапрадукцыйная тэхніка ў асноўным камп'ютарызаваная. Але ж нязменным застаецца адно — сумленнасць працаўніка, шчырасць у адносінах да зямлі і сваёй справы. Бо зямлю не падманеш. Недзе не дагледзеў, прапусціў, махнуў рукой — потым яно абавязкова вылезе, і не толькі стратай на канкрэтным адрэзку часу, але і пазней. Агрэхі ў тэхналогіі цягнуць за сабой ланцужок праблем, на вырашэнне якіх можа спатрэбіцца шмат часу».

Пётр Білецкі ганарыцца сваім калектывам. Расказваў, што назіраў у полі, калі вопытныя механізатары паказвалі маладзейшым, як правільна ўзараць, а старэйшыя жывёлаводы вучылі маладых нюансам догляду. А яшчэ ганарыцца сваім кіруючым звяном — мазгавым цэнтрам, які складаюць спецыялісты гаспадаркі. Напрыклад, **галоўны інжынер Юрый ЛАШКЕВІЧ,** ветэран аграрнай працы і ас калгаснай механізацыі.

Юрый Міхайлавіча знаходзім на машынным двары. Цяпер яго цэх механізацыі складаецца са 120 спецыялістаў, якія працуюць у мехатрадзе, аўтагаражах, рамонтнай майстэрні, на машынным двары, у жывёлагадоўлі. Працоўнае крэда інжынера Лашкевіча — тэхнічны парк павінен пастаянна абслугоўвацца на самым высокім узроўні. Дастаткова глянуць на памяшканне майстэрні, каб упэўніцца, што парадак падтрымліваецца ва ўсім, што ён дысцыплінуе, а ўмовы, створаныя для працаўнікоў, спараджаюць адказнасць і павагу. Той факт, што і ў машынным, і ў трактарным парку гаспадаркі няма вакансій, гаворыць пра многае.

**Начальнік механізаванага атрада Уладзімір КАРУНАС** забяспечвае тэхналагічны працэс як у полі, так і на ферме. Яго епархія — 43 трактары, сем збожжаўборачных камбайнаў, пяць кормаўборачных машын. Усе яны павінны быць спраўнымі і па меры неабходнасці выходзіць на аб'екты. Справа, як быццам простая, калі працэс адладжаны.

Уладзімір Уладзіміравіч паходзіць з вялікай вясковай дынастыі. У гэтай гаспадарцы працавалі яго бацькі, тут працуюць жонка, сястра, брат, сыны Аляксандр і Дзмітрый таксама шчыруюць у галіне механізацыі.

— На работу тады яшчэ ў калгас прыйшоў адразу пасля службы ў арміі, вось толькі з грамадзянствам былі праблемы, — згадвае з усмешкай Уладзімір.

— ?!

— Так, нарадзіўся і вырас тут. Пасля заканчэння Пружанскага сельгастэхнікума ў армію пайшоў. Служыў на тэрыторыі Расіі. А калі тэрмін скончыўся, Саюза ўжо не стала. Аказалася, што я прыехаў у незалежную Беларусь з іншай краіны з усімі наступствамі. Карацей, давялося пабегаць па інстанцыях, каб атрымаць грамадзянства. Ну а цяпер ёсць што ўспомніць ды дзецям, унукам расказаць. Адно я ведаю: няма нідзе лепей, як у нас у Мураве. На месцы работа, жыллё, маладым ёсць магчымасць вучыцца, павышаць кваліфікацыю, расці ў плане кар'еры. Ну і працаваць, вядома ж, не ленавацца. У нас ёсць з каго браць прыклад. Хоць бы з такіх механізатараў, як Анатоль Савіцкі, Мікалай Бульчук.



На машынным двары: загадчык майстэрні Віталь БЕРАЗНЮК, галоўны інжынер Юрый ЛАШКЕВІЧ, загадчык машыннага двара Аляксандр КАРУНАС, начальнік мехатрада Уладзімір КАРУНАС, намеснік дырэктара гаспадаркі Аляксандр МАРКЕЧКА.

З **Мікалаем БУЛЬЧУКОМ** мы сустрэліся побач з мехдваром каля яго аграмаднага «Амкадора». Зараз ён заняты дастаўкай кармоў на жывёлагадоўчыя аб'екты.

— Біяграфія тыповая, — гаворыць механізатар. — Родам з суседняй вёскі. У школе вучыўся ў Мураве. А потым, пасля службы ў ВМФ, вярнуўся ў сваю гаспадарку. Сеў на трактар, і вось ужо 35 гадоў стажу. Па старых мерках, дык ветэран працы, — усміхаецца суразмоўнік.

Як удалося даведацца, Мікалай Уладзіміравіч не проста ветэран земляробнай справы — роўных яму пашукаць. Усе гэтыя 35 гадоў у жніво аграрый убірае хлеб. Калі збажына сабраная — пераходзіць на буракаўборачны камбайн, потым працуе на іншых трактарах, такіх як гэты «Амкадор». Работы хапае.

Дом атрымаў у свой час у гаспадарцы, выкупілі яго з жонкай, прыватызавалі. Трымаюць невялікую падсобную гаспадарку: як жа без гэтага ў вёсцы? Гаворыць, што зарплата прыстойная, дом добраўпарадкаваны, з усімі выгодамі... Пацікавілася, як ён праводзіць адпачынак. Сказаў, што ў працоўны водпуск ходзіць найбольш зімой, хоць часам выпадала і ў красавіку, і ў маі. Адпачывае найчасцей на прысядзібным участку. У экзатычныя краіны на курорты не ездзіў, хіба пасля выхаду на пенсію адважыцца.

Першага мая ў Мікалая Уладзіміравіча будзе рабочы дзень. На комплексе — тысячы галоў жывёлы. Кармы ім павінны быць дастаўлены строга па распарадку. За гэтым сочыць дзяжурны намеснік начальніка малочнатаварнага комплексу. Калі мы прыехалі, на змене была Святлана Ленкавец.

Рабочы дзень, альбо змена, у Святланы Іванаўны пачынаецца а палове пятай раніцы. У пяць — дойка, да гэтага часу ўжо ўсе аператары машыннага даення на месцы, вырашаюцца бягучыя арганізацыйныя пытанні і запускаецца рабочы працэс. Святлана Ленкавец таксама пачынала з аператара машыннага даення і вырасла да намесніка начальніка. Свой калектыў яна лічыць дружным, гаворыць, што паказчык іх работы — якасць прадукцыі. Усё малако з комплексу «Мурава» прадаецца гатункам «Экстра». Адсюль — зарплата, прэміі, ну і пашана за працу.

На гэтым комплексе ўтрымліваецца не толькі дойны статак: больш за 600 галоў маладняку даглядаюць **Людміла і Уладзімір УСАЧОВЫ.** Дакладней, Людміла гадуе 323 цяляці ад трох месяцаў да года, потым перадае статак мужу, які даглядае іх да ўзросту 18 месяцаў. Вядома, працэс у многім механізаваны, але і ручной работы хапае, напрыклад, падсцілаць стойлы свежай саломай. А з малымі цяляткамі, зразумела, асобны клопат.

Уладзімір расказаў, што сям'я яго родам з Веткаўскага раёна. Пасля чарнобыльскай трагедыі вёску адсялялі, бацькі прыехалі ў Пружанскі раён. Так ён апынуўся тут, і гэта мясціна ўжо стала другой радзімай:

— Працаваў некаторы час у лясніцтве, на будоўлі, а цяпер ужо з дзясятак гадоў на ферме і зразумеў, што гэта маё. Жывёлу трэба любіць, інакш няма чаго брацца за гэтую работу.

Любоў да жывой істоты назвалі фактарам выбару прафесіі маладыя спецыялісты, **ветурачы гаспадаркі Дар'я Лявоцкая і Дзмітрый КРАЙНІК.** Абое яны прыехалі па размеркаванні пасля заканчэння Пінскага аграрнага каледжа. Дзмітрый працуе два гады, Дар'я — год. Яна прызнаецца, што ўсяму давялося вучыцца на ферме. Вырасла ў горадзе, дома «лячыла» толькі свайго коціка, падчас вучобы атрымала пераважна тэорыю. А жывёлы спачатку нават баялася. Дапамагаў Дзіма, як больш вопытны, ну і, вядома, Віктар Уладзіміравіч Міхальчык, ветурач гаспадаркі... Гэта цяпер яна сама ўпраўляецца з падшэфнымі: на вока навучылася вызначаць, як тое ж цялятка ідзе на папраўку ў выніку лячэння, — і гэта прыносіць задавальненне.

— У жывёлагадоўчай галіне так пабудаваны графікі работы, што людзі маюць гарантаваныя выхадныя дні, ды і механізатары працуюць з выхаднымі, якія прызначаюцца ў адпаведнасці з вытворчай неабходнасцю і падганяюцца пад вытворчы працэс. Таму нехта будзе працаваць на Першамай, нехта — на Вялікдзень, — гаворыць **намеснік дырэктара гаспадаркі Аляксандр МАРКЕЧКА,** — да гэтага людзі ставяцца з разуменнем.

У сваім калектыве мы асабліва шануем ветэранаў вытворчасці, стараемся падтрымаць маладых спецыялістаў, — працягвае Аляксандр Іванавіч. — Можна, вядома, прыехаць, адпрацаваць вызначаны тэрмін і з'ехаць. А тыя, хто застаецца, выбіраюць не толькі работу, але і ўклад жыцця. Каб застацца ў вёсцы, трэба яе адчуць, палюбіць, як ні пафасна гэта гучыць. Вось, скажам, ёсць у нас начальнік вытворчага ўчастка Анатоль Сахарчук. Работы ў яго на вытворчасці хапае. Але ў чалавека ёсць хобі: ён займаецца вывучэннем гісторыі свайго краю, знаходзіць звесткі нават аб далёкім мінулым. Гэта ён адшукаў пісьмовыя ўпамінанні пра Мураву, датаваныя 1563-м. Нядаўна паставілі валун з гэтай датай, каб усе ведалі, што вёсцы хутка 460 гадоў, што ў часы Сярэднявечча тут жылі людзі, расцілі хлеб, гадавалі дзяцей. А мы — іх нашчадкі.



Ветурачы Дзмітрый КРАЙНІК, Віктар МІХАЛЬЧЫК, Дар'я ЛЯВОЦКАЯ.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

*Пружанскі раён.*

Сацыяльны вектар

# У маі павысяцца «ўзроставыя» даплаты пенсіянерам

**У сувязі з павелічэннем бюджэту пражытачнага мінімуму з мая «ўзроставыя» даплаты, якія выплачваюцца органамі сацыяльнай абароны пенсіянерам ва ўзросце старэй за 75 гадоў, падрастуць на чатыры працэнты, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

У цяперашні час даплата пенсіянерам ва ўзросце 75—79 гадоў складае 49,3 рубля, а асобам ва ўзросце 80 гадоў і старэй — 65,7 рубля.

З мая гэтыя выплаты павялічацца на чатыры працэнты — да 51,2 рубля і 68,3 рубля адпаведна.

Павялічыцца таксама і памер надбаўкі на догляд, якая выплачваецца пенсіянерам, што дасягнулі 80-гадовага ўзросту, з 32,9 рубля ў красавіку да 34,2 рубля ў маі.

Такім чынам, у структуры пенсіі 80-гадовага пенсіянера памер «узроставай» даплаты і надбаўкі з 1 мая складзе 102,5 рубля.

Атрымальнікаў «ўзроставых» даплат і надбавак на догляд у краіне больш за 524 тысячы чалавек. Выдаткі на іх фінансаванне складуць амаль 45 мільёнаў рублёў, а ў цэлым за год — больш за 530 мільёнаў рублёў.

Гэта другое павышэнне выплат у бягучым годзе, папярэдняе было ў лютым.

Варта адзначыць, што надбаўка на догляд устаноўлена з 1993 года, а «ўзроставыя» даплаты — з 2012 года. Такія выплаты назначаюцца да пенсіі аўтаматычна з месяца, наступнага за месяцам дасягнення пенсіянерам узросту 75 або 80 гадоў, і індэксуюцца штоквартальна з улікам змянення бюджэту пражытковага мінімуму. Нагадаем, што з мая бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва павялічваецца на 4 працэнты — з 262,87 рубля да 273,27 рубля.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# РЭГІСТРАЦЫЯ НА ЦТ АНЛАЙН І АФЛАЙН

**2 мая ў краіне распачнецца рэгістрацыя абітурыентаў на цэнтралізаванае тэсціраванне. Зрабіць гэта трэба не пазней за 1 чэрвеня.**

Пункты рэгістрацыі будуць працаваць з 9.00 да 18.00 — у нядзелю 2 мая, з 9.00 да 19.00 у буднія дні і з 9.00 да 18.00 — па суботах 15 і 29 мая. Выхадныя дні — 8, 9, 10, 11, 16, 22, 23 і 30 мая.

У абітурыентаў ёсць выбар: рэгістравацца на ЦТ анлайн або прыйсці ў пункт рэгістрацыі асабіста.

## Рэгістрацыя анлайн

Запісацца на ЦТ 2021 можна праз спецыяльную форму на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Папярэдняя рэгістрацыя будзе даступная з 9 гадзін 2 мая да 12 гадзін 1 чэрвеня. У апошні дзень пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў 19 гадзін падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста.

Спачатку трэба будзе ўвесці свае даныя (серыя і нумар дакумента, які сведчыць асобу, мабільны нумар тэлефона). Затым абітурыенту прыйдзе SMS з паролем да асабістага кабінета. Ён фарміруецца ў момант першага ўваходу. У наступныя разы трэба будзе толькі ўвесці лагін і пароль.

Абітурыент выбірае вучэбныя прадметы і пункты тэсціравання. Далей ён павінен аплаціць удзел у ЦТ праз сістэму АРІП (не пазней за 1 чэрвеня), выкарыстоўваючы нумар свайго асабовага рахунку, названага ў асабістым кабінеце сістэмы рэгістрацыі. Гэта сума складае 2,9 рубля за адзін вучэбны прадмет (у кошт закладваюцца выдаткі на работу пунктаў рэгістрацыі, афармленне дакументаў і правядзенне экзамену). І, каб завяршыць працэдуру, трэба прыйсці ў адзін з абраных пунктаў ЦТ і забраць пропускі. Без іх на тэсціраванне не пусцяць.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, павінны ў прапанаваных ім пунктах рэгістрацыі дату і час асабіста (або праз законнага прадстаўніка) падаць заяву і забраць у пункце рэгістрацыі пропускі, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць права на льготу, і іх ксеракопіі.

Прыйсці па пропуск трэба не пазней за 1 чэрвеня. У графе «Абраныя прадметы і пункты тэсціравання» будуць указаны адрасы пунктаў рэгістрацыі, у адзін з якіх неабходна будзе звярнуцца пасля здзяйснення аплаты. Пры сабе трэба мець пашпарт або від на жыхарства, пасведчанне бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі.

## Рэгістрацыя асабіста

Калі абітурыент жадае запісацца на ЦТ афлайн, ён (або яго законны прадстаўнік) можа звярнуцца ў адзін з 41 пунктаў рэгістрацыі. Аднак у любы час гэта зрабіць немагчыма. З-за пандэміі, каб не дапусціць высокай канцэнтрацыі людзей у замкнёнай прасторы, пункт рэгістрацыі кожнаму абітурыенту прызначае пэўныя дату і час для візіту. Пры сабе абавязкова трэба мець пашпарт і грошы для аплаты ЦТ. Інфармацыю аб тым, якім чынам арганізуецца чарга, размесцяць на сайце пункта рэгістрацыі.

У кожным з пунктаў тэсціравання абітурыент можна запісацца ў любую ВНУ, дзе яму будзе больш зручна здаваць экзамен. Усё таму, што сістэма рэгістрацыі аўтаматызаваная. Напрыклад, прыйшоўшы ў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт, можна падаць заяўку на здачу ЦТ у Мінску, Гродне, Гомелі, Брэсце і г. д. І зусім неабавязкова пісаць тэсціраванне ў ВНУ, куды абітурыент збіраецца паступаць. Лепш выбраць месца бліжэй да дома, каб пазбегнуць непрадбачаных сітуацый (спазненне транспарту, забытыя дакументы і г. д.).

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш як на чатыры дысцыпліны. Такім чынам, у іх ёсць магчымасць ракіроўкі пры паступленні на роднасныя спецыяльнасці.

Пры жаданні можна памяняць прадметы для здачы на ЦТ. **Да атрымання пропускаў** у асабістым кабінеце можна змяніць даныя ў заяве: набор прадметаў, мову тэсту і г. д. Калі з'явіцца неабходнасць гэта зрабіць ужо **пасля атрымання пропуску,** трэба будзе звяртацца ў пункт ЦТ асабіста. Адпаведна, калі абітурыент рэгістраваўся афлайн, то і змены ўносяцца ў тым пункце, дзе ён пісаў заяву. Аднак усе маніпуляцыі можна будзе зрабіць толькі да 1 чэрвеня (уключна).

**Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ.** Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

**Абітурыентам варта нагадаць, што працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропускаў. Менавіта ў пропуску ўказваецца інфармацыя, калі і куды трэба прыходзіць у дзень правядзення тэсціравання.**

Пропуск для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні лічыцца зарэгістраваным, калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуску выдаецца дублікат.

Замежнікі могуць зарэгістравацца на ЦТ любым з вышэйпералічаных спосабаў. Калі няма магчымасці аплаціць удзел у ЦТ і атрымаць пропускі да 1 чэрвеня, то можна прайсці рэгістрацыю па прыбыцці ў Беларусь. Трэба будзе звярнуцца ў пункт рэгістрацыі не пазней чым за адзін дзень да пачатку тэсціравання, атрымаць асабовы рахунак, унесці плату за прыём і афармленне дакументаў праз сістэму «Разлік» (АРІП), выкарыстоўваючы нумар асабовага рахунку, атрыманага ў пункце рэгістрацыі. Пры сабе, вядома, трэба мець пашпарт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. Тел.: +375 17 259-18-53** |

**Предмет аукциона**

**Лоты № № 1–16 оорудование, бывшее в употреблении.**
Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

| Лот, № | Наименование | Инв. № | Начальная цена* (с НДС 20 %), дол. США | Шаг аукциона, дол. США |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Аппарат гидроабразивной резки** | 70103 | **61 344,00** | 3 067,20 |
| 2 | **Аппарат плазмен. резки CUT120 IGBT** | 70074 | **475,20** | 23,76 |
| 3 | **Вертикальный обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой управления GPPlus 450** | 70089 | **27 000,00** | 1 350,00 |
| 4 | **Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC** | 41031 | **59 400,00** | 2 970,00 |
| 5 | **Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124** | 70124 | **60 264,00** | 3 013,20 |
| 6 | **Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4** | 41028 | **39 312,00** | 1 965,60 |
| 7 | **Станок плоскошлиф. ОШ424Ф11 с УЦИ** | 41021 | **9 600,00** | 480,00 |
| 8 | **Станок радиально-сверлильный 2К522** | 41022 | **3 564,00** | 178,20 |
| 9 | **Станок спец. ленточно-отрез. МП6-1570** | 41007 | **1 728,00** | 86,40 |
| 10 | **Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133** | 70179 | **835 920,00** | 41 796,00 |
| 11 | **Токар. станок с индикатором положения Turnado 280/1500** | 41033 | **4 860,00** | 243,00 |
| 12 | **Токарный станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330** | 41034 | **30 240,00** | 1 512,00 |
| 13 | **Широкоунивер. фрезерный станок с УЦИ ZX 635OC** | 41025 | **7 560,00** | 378,00 |
| 14 | **Универсальный фрез. станок FU-400 RAP** | 41011 | **7 560,00** | 378,00 |
| 15 | **Станок консольно-фрезерный ВМ127М** | 41019 | **12 960,00** | 648,00 |
| 16 | **Станок отрезной ДОС** | 41012 | **291,60** | 14,58 |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

**Лот № 17**

| Наименование | Об. пл. | Инвен. номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Производственно-складское помещение** | 893,9 кв. м | 500/D-798186687 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 12-2** |
| **Складское помещение** | 1127,4 кв. м | 500/D-798186686 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12-1** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 17 (с НДС 20 %) – 512 109,36 дол. США**
Шаг аукциона – 25 605,47 дол. США

**Лот № 18**

| | |
|---|---|
| **Ограждение бетонное (**инв. номер 980773) | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12** |

**Начальная цена лота № 18 (с НДС 20 %) – 3 060,00 дол. США**
Шаг аукциона – 153,00 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 17 и № 18:*** пл. **0,8393 га** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоян. пользования (доля: 9/20) для обслуживания здания специализир. складов, торг. баз, баз матер.-технич. снабжения, хранилищ. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны линий связи и радиофикации (пл. 0,0883 га), электрич. сетей (пл. 0,1015 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4060 га) и канализации (пл. 0,0580 га)

**Лот № 19**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Административное, производственное** | 2007,2 кв. м | 500/С-21619 | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 19 (с НДС 20 %) – 1 004 024,74 дол. США**
Шаг аукциона – 50 201,24 дол. США

**Лот № 20**

| | |
|---|---|
| **Домик-сторожка** (инв. № 2) | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |
| **Ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4) | |
| **Ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5) | |
| **Теплотрасса** (инв. номер 30121) | |

**Начальная цена лота № 20 (с НДС 20 %) – 3 607,20 дол. США**
Шаг аукциона – 180,36 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 19 и № 20:*** пл. **0,3600 га** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. Целевое назначение: реконструкция здания кассет. цеха с размещением административ. помещений и механосбороч. производства. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

• Цена снижена по лотам № 1–6 и № 8–16 на 10 %, № 17–18 на 50 %, № 19-20 на 40 %

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию, тел. +375 (29) 5012219 (Дегтярев А.В.), + 375 (29) 190 56 39 (Садко К.В.)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику, при его согласии, по начальной цене увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок заключения договора купли-продажи – 10 (десять) дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лотам № № 1–16 – 23.03.2021, по лотам № 17 – 17.04.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.05.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений** | **с 09.00 30.04.2021 до 17.00 13.05.2021,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Закрытое акционерное общество «Центр промышленной оценки»,** организующее электронные торги на основании договора поручения, извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Открытому акционерному обществу «СТРОЙМАШ»** (УНП 100104712), в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 178-13Б/2018 в экономическом суде города Минска.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества: **недвижимое и иное имущество, реализуемое одним лотом.**

Информация о предмете электронных торгов, в том числе место нахождения:

**Недвижимое и иное имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 26**

| Лот, № | Наименование (назначение) | Общ. пл., кв. м | Инв. № |
|---|---|---|---|
| 1 | **А 3/К здание административного корпуса** (здание административно-хозяйственное) | 1 734 | 500/С-20188 |

**В состав лота входит иное имущество согласно Приложению № 1. Перечень размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

**Сведения о земельном участке: з**емельный участок общей площадью 0,2199 га предоставлен на праве аренды по 31.05.2029 для обслуживания здания административно-хозяйственного

Начальная цена, бел. руб. с НДС 20 % – 2 482 764,00.

Минимальная цена, бел. руб. с НДС 20 % – 2 234 487,60.

Размер шага составляет **5 (пять) процентов от начальной цены лота**.

Ограничение/обременение: ипотека, аренда.

Дата и время начала электронных торгов: **18.05.2021 в 09.00.**

Дата и время завершения электронных торгов: **18.05.2021 в 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке «ИПМ-Торги» (оператор – ООО «ИПМ-Консалт оценка») по электронному адресу www.ipmtorgi.by.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу www.ipmtorgi.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 17.00 14.05.2021 (включительно).**

**Задаток в сумме 248 276,40 бел. руб.** должен быть перечислен на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником возможна продажа данного объекта заявившемуся участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Договор купли-продажи Покупатель обязан подписать в течение 3 (трех) календарных дней с момента его получения, но не позднее **10 (десяти) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов.

Справочная информация:

Контактные данные лица, организующего электронные торги на основании договора поручения: тел: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06, эл. почта: auction@cpo.by.

Контактные данные лица, ответственного за ознакомление с предметом электронных торгов: 8044-505-16-54 (Николай Маркович).

Ознакомление с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 по 16.00.

Вознаграждение организатора торгов установлено в размере **3 процентов** от цены продажи лота и, согласно договору поручения, возмещается покупателем.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют не более 400,00 белорусских рублей.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

## ОАО «Трест Белстромремонт»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРИНЯТОМ ЛИКВИДАТОРОМ 26 апреля 2021 года РЕШЕНИИ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Трест Белстромремонт»**

1. Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Трест Белстромремонт» состоится **12 мая 2021 года** в помещении ликвидатора по адресу: **Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122**, время начала собрания: **14.00.**

2. Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров Общества:

**Вопрос 1.** Об избрании председателя настоящего внеочередного общего собрания ОАО «Трест Белстромремонт».

**Вопрос 2.** Об утверждении представленного ликвидатором промежуточного ликвидационного баланса ОАО «Трест Белстромремонт».

**Вопрос 3.** О принятии решения о нецелесообразности проведения досудебного оздоровления ОАО «Трест Белстромремонт».

**Вопрос 4.** О согласовании подачи в экономический суд заявления должника об экономической несостоятельности (банкротстве) ОАО «Трест Белстромремонт».

Орган Общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров Общества: ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант».

Порядок ознакомления лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров Общества, с указанными документами и информацией – **04 мая 2021 года с 10.00 до 18.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122.**

Место и время регистрации лиц, имеющих право на участие в общем собрании: **с 13.00 до 14.00 12 мая по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122.**

**Лицам, имеющим право на участие во внеочередном общем собрании акционеров Общества необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.**

УНП 100135597

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

30 красавіка 2021 г. № 16 (601)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ










Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗА АДРАДЖЭННЕМ — РАЗВІЦЦЁ

**У Слаўгарадзе пад старшынствам спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ прайшло пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. На парадку дня было вельмі актуальнае пытанне: работа мясцовай улады па ўстойлівым развіцці рэгіёнаў і рэабілітацыі пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС тэрыторый.**

## Ёсць чаму павучыцца

Ва ўступным слове Наталля Качанава звярнула ўвагу прысутных на асаблівую ролю мясцовых органаў улады ў вырашэнні злабадзённых праблем жыхароў Магілёўскай вобласці ў цэлым і Слаўгарадскага раёна ў прыватнасці.

Як паведаміў **старшыня Слаўгарадскага райвыканкама Сяргей МІХАЛЮТА,** новы этап у жыцці раёна пачаўся пасля падпісання ў 2015 годзе Указа Прэзідэнта № 235 аб мерах па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгёна Магілёўскай вобласці. Ён агучыў такія факты і лічбы: раёну выдзелілі больш за 163 мільёны рублёў. Яны пайшлі на набыццё рознай тэхнікі, былі атрыманы льготныя крэдыты на ўзвядзенне дамоў. Толькі летась пабудавалі масты пераход праз раку Сож, дзіцячы садок, пачалі рэканструкцыю дзвюх школ — у аграгарадку Лапацічы і сярэдняй № 2 у раённым цэнтры. Летась здалі два шматкватэрныя жылыя дамы, зараз будуецца 20-кватэрны дом. У верасні плануецца здача дома сямейнага тыпу, у кастрычніку мяркуецца распачаць узвядзенне яшчэ аднаго. Таксама вядзецца капітальны рамонт трох дамоў, была грунтоўна аднаўлена і пераабсталявана раённая бальніца і мясцовы стадыён.

Сёлета плануецца адкрыць вытворчасць на новым прадпрыемстве «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» па выпуску мармеладу і цукерак. А гэта больш за 100 новых працоўных месцаў. Зараз ідзе мадэрнізацыя лініі па вытворчасці сыроў філіяла «Слаўгарадскі» ААТ «Бабулін гладыш», што дазволіць палепшыць якасць і прывабнасць прадукцыі: выпускаць сёння больш запатрабаваныя спажыўцом сыры не круглай, а квадратнай формы, тым самым узняць іх канкурэнтаздольнасць на рынку.

Слаўгарадскі раён сельскагаспадарчы. Галоўнае яго багацце — людзі і зямля. Летась у раёне амаль удвая павялічылі валавы збор збожжа: з 19 цэнтнераў да 27,5 цэнтнера з гектара. Значна павялічылі нарыхтоўку кармоў.

Сёлета ў першым квартале рост вытворчасці малака склаў 116 %, мяса — ажно 269 %. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала завяршэнне будаўніцтва акцыянерным таварыствам «Магілёўскі мясакамбінат» каля вёскі Перагон свінагадоўчага комплексу праектнай магутнасцю на 24 тысячы галоў у год. Тут, між іншым, ёсць і свой камбікормавы цэх. Ужо сёння на комплексе працуе 85 чалавек, паведаміў Сяргей Міхалюта.

Карацей, раён жыве і паспяхова працуе. За адраджэннем, стабілізацыяй ідзе яго планамернае і мэтанакіраванае развіццё. Невыпадкова Наталля Качанава падчас пасяджэння адзначыла, што ўбачанае ў Слаўгарадзе заслугоўвае ўсялякай хвалы. Тут не толькі засвойваюцца сродкі, якія выдаткоўваюцца на развіццё раёна, але і адкрываюцца вытворчасці, а гэта вельмі важна, лічыць спікер верхняй палаты парламента.

## Моцныя рэгіёны — моцная краіна

**Намеснік міністра эканомікі Анжаліка НІКІЦІНА** свой даклад прысвяціла аналізу асноўных тэндэнцый развіцця рэгіёнаў Магілёўскай вобласці і Слаўгарадскага раёна ў бягучай пяцігодцы. Паводле яе слоў, сёння ствараюцца ўсе ўмовы для таго, каб кожны рэгіён здолеў максімальна раскрыць сваю спецыялізацыю, патэнцыял і канкурэнтныя перавагі. Агульная задача для іх — забяспечыць базавыя ўмовы для мясцовага насельніцтва: дастатковую наяўнасць працоўных месцаў і камфортнае бяспечнае асяроддзе пражывання.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

АКЦЭНТЫ

# Як будзе трансфармавацца палітычная сістэма краіны?

**На гэтым тыдні прайшло трэцяе пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі. На ім разглядаліся прапановы аб змяненні канстытуцыйных палажэнняў аб функцыях і паўнамоцтвах Прэзідэнта Беларусі і ўрада — Савета Міністраў.**

Нагадаем, што першае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі адбылося 31 сакавіка. Тады ж быў зацверджаны графік пасяджэнняў, якія праходзяць двойчы на месяц.

Як паведаміў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі, член Канстытуцыйнай камісіі Сяргей СІВЕЦ,** у сваёй большасці грамадзяне падтрымліваюць цяперашні канстытуцыйна-прававы статус Прэзідэнта, перадае БелТА.

— У большасці сваёй грамадзяне падтрымліваюць цяперашні канстытуцыйна-прававы статус Прэзідэнта як кіраўніка дзяржавы, гаранта дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці, Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян, арбітра ва ўзаемаадносінах паміж галінамі ўлады, — адзначыў сенатар. — У той жа час уносяць шэраг ініцыятыў, звязаных са змяненнем выбарчых цэнзаў, якія ўжываюцца да кандыдатаў на самы высокі дзяржаўны пост у краіне. У прыватнасці, гэтыя ініцыятывы датычацца як змянення ўзросту, так і цэнзу аседласці, гэта значыць патрабавання пастаяннага пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама цэнзу, звязанага з забаронай на захоўванне маёмасці кіраўніка дзяржавы за мяжой.

Па яго словах, таксама ўносяцца прапановы, звязаныя з унясеннем у Канстытуцыю так званага дэмакратычнага стандарту абмежавання тэрміну паўнамоцтваў Прэзідэнта ў дачыненні да адной і той жа асобы.

— Прапановы розныя: гэта і адзін тэрмін, і два, і два тэрміны запар, альбо наогул недапушчэнне якіх-небудзь абмежаванняў, — адзначыў сенатар.

Прапановы грамадзян датычацца замацавання ў Канстытуцыі гарантый прававога статусу Прэзідэнта, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў, а таксама членаў яго сям'і. Былі прапановы, звязаныя з узаемаадносінамі кіраўніка дзяржавы з урадам, прэм'ер-міністрам, наконт парадку фарміравання склада ўрада і пераразмеркавання паўнамоцтваў.

Старшыня профільнай камісіі падкрэсліў, што ў цэлым пакуль рана рабіць нейкія высновы пра тое, як будзе трансфармавацца палітычная сістэма краіны. Сяргей Сівец звяртае ўвагу, што, як правіла, на палітычным полі актыўную ролю адыгрываюць тры дзеючыя сілы — Прэзідэнт, парламент і ўрад.

— Зыходзячы з таго, наколькі ўдала паміж імі размеркаваны паўнамоцтвы па фарміраванні і функцыянаванні дзяржапарату, залежыць эфектыўнасць палітычнай сістэмы ў цэлым. Пакуль мы разглядаем толькі двух актыўных суб'ектаў — гэта Прэзідэнт і ўрад, парламент будзем разглядаць на наступным пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі. Я думаю, што гэтая канструкцыя, якая прапануецца грамадзянамі, адчуе змены ў частцы пераразмеркавання менавіта канстытуцыйна-прававых паўнамоцтваў паміж трыма ключавымі палітычнымі інстытутамі, — рэзюмаваў Сяргей Сівец.

### Даведка «МС»

Нагадаем, што ў склад Канстытуцыйнай камісіі ўваходзяць старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, якая з'яўляецца намеснікам старшыні гэтай камісіі; віцэ-спікер верхняй палаты парламента Анатоль Ісачанка, старшыні Пастаянных камісій Савета Рэспублікі Сяргей Сівец, Таццяна Рунец, сенатары Алег Румо і Наталля Якубіцкая, а таксама старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Ягор Макарэвіч.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

## На шляху да мэт

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі сустрэўся з прадстаўніком Дзіцячага фонду ААН у Беларусі**

**Нацыянальны каардынатар па дасягненні мэт устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА правёў сустрэчу з прадстаўніком Дзіцячага фонду ААН у Беларусі Таняй РАДАЧАЙ.**

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся стан і напрамкі далейшага развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння з ЮНІСЕФ па лініі нацыянальнага каардынатара па дасягненні МУР, у тым ліку напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей, які адзначаецца штогод 1 чэрвеня, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

— Нам важна выбудоўваць супрацоўніцтва на канкрэтных праектах, якія адчувальныя для грамадзян Беларусі. Таму яшчэ раз адзначу важнасць рэгіянальнага аспекту ў нашай дзейнасці, — падкрэсліў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Удзельнікі сустрэчы таксама разгледзелі перспектывы рэалізацыі праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі па падтрымцы функцыянавання архітэктуры па дасягненні МУР у Беларусі.

# ЗА АДРАДЖЭННЕМ — РАЗВІЦЦЁ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Што датычыцца прыярытэтаў тэрытарыяльнага развіцця, то тут захоўваецца пераемнасць ранейшых вектараў. 11 гарадоў з колькасцю насельніцтва 80 тысяч і больш павінны стаць флагманамі развіцця. У Магілёўскай вобласці гэта Бабруйск. Для прыцягнення інвестараў ужо ствараюцца індустрыяльныя пляцоўкі пад адкрыццё новых вытворчасцяў з неабходнай інжынернай інфраструктурай. Кожная пляцоўка будзе мець свой пашпарт.

У сярэдніх і невялікіх гарадах, як і ў сельскіх раёнах накшталт Слаўгарадскага, стаўка будзе зроблена на перапрацоўку мясцовых рэсурсаў. Кожны раён за пяцігодку павінен будзе рэалізаваць як мінімум два такія праекты.

Анжаліка Нікіціна запрасіла прысутных сенатараў, дэпутатаў раённых і абласных Саветаў актыўна далучацца да засваення прыродных багаццяў рэгіёнаў і тым самым узяць удзел у паскарэнні іх сацыяльна-эканамічнага развіцця. Напрыклад, у Слаўгарадскім раёне гэта можа быць далейшае пашырэнне дрэваапрацоўкі на аснове сучасных тэхналогій па выпуску прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, развіццё экспарту новых для раёна паслуг, у першую чаргу турыстычных.

На думку намесніка міністра эканомікі, досвед работы па адраджэнні пацярпелых ад радыяцыі рэгіёнаў Украіны паказаў эфектыўнасць пазнавальнага экалагічнага турызму. Але яго арганізацыя запатрабуе дакладнай і ўзважанай прапрацоўкі, кваліфікаванай падрыхтоўкі дэманстрацыйных матэрыялаў, што не вельмі проста зрабіць. Але можна. У Слаўгарадскім раёне можа развівацца і гастранамічны турызм, бо тут адроджаны традыцыі хатняга сыраварання. Ёсць неблагія шанцы для развіцця рамёстваў з мясцовым каларытам, арганічнага земляробства. Увогуле, выкарыстанне мясцовых рэсурсаў і магчымасцяў дазволіць палепшыць эканоміку рэгіёнаў краіны, лічыць Анжаліка Нікіціна.

Дарэчы, у Слаўгарад для ўдзелу ў пасяджэнні прыехалі таксама старшыні Пастаянных камісій Савета Рэспублікі і члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў краіны, дэпутаты раённых і абласных Саветаў, прадстаўнікі адміністрацый мясцовых улад рэгіёнаў.

Падчас дыскусіі Наталля Качанава заўважыла, што ход размовы сведчыць аб неабходнасці даць больш свабоды ў вырашэнні мясцовых праблем і задач менавіта мясцовым органам улады. Бо яны знаходзяцца нібы на перадавой, непасрэдна працуюць з людзьмі і лепш ведаюць, што і як рабіць у першую чаргу. Рэгіёнам патрэбна пастаянная ўвага. Гэта нашы пункты росту, падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

## Платформа электроннага ўрада будзе ўдасканальвацца

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ прыняў удзел у І Міжнародным форуме #GBC «Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне».**

Мерапрыемства прайшло ў сталіцы 28—29 красавіка. Яго асноўная мэта — прэзентацыя дасягненняў і праектаў у галіне электроннага ўрада, абмен вопытам, развіццё партнёрства і міжведамаснага ўзаемадзеяння, пошук новых шляхоў лічбавізацыі і ўзаемадзеяння дзяржавы, бізнесу і грамадзян шляхам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

— Ужо зроблена нямала для таго, каб у нашай краіне лічбавыя пераўтварэнні набылі ўстойлівы і незваротны характар. Вядома, хацелася б, у першую чаргу, адзначыць тое, што платформа электроннага ўрада ў нас мадэрнізавана і цяпер валодае больш шырокімі магчымасцямі з пункту гледжання атрымання электронных паслуг насельніцтвам, бізнесам, — цытуе БелТА **міністра сувязі і інфарматызацыі Канстанціна ШУЛЬГАНА** з адкрыцця мерапрыемства.

Кіраўнік ведамства адзначыў, што платформа электроннага ўрада будзе і далей удасканальвацца. Гэта, на яго думку, універсальны механізм, які дасць беларусам магчымасць «уступіць у зусім іншую эпоху электронных зносін паміж дзяржавай, чалавекам і бізнесам».

Арганізатарамі форуму выступілі рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам» і «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг» пры падтрымцы Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

## Што хвалюе?

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Аляксей НЯВЕРАЎ правёў «прамую тэлефонную лінію» ў рэдакцыі газеты «Гомельская праўда».**

Пытанні, з якімі гамяльчане звярнуліся да парламентарыя, традыцыйна датычыліся працоўнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь: работы на аддаленым доступе, работы звыш нормы, сацыяльных гарантый работнікам.

Сенатар даў вычарпальныя тлумачэнні, а асобным грамадзянам прапанаваў прыйсці на асабісты прыём і дэталёва разабрацца ў сітуацыі, якая ў іх склалася.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# АД АГУЛЬНАГА ДА АСАБІСТАГА

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў прыём грамадзян.**

Да сенатара запісаліся чатыры чалавекі, кожная з якіх прывяла свая жыццёвая праблема.

Як падкрэсліў у размове з журналістамі старшыня профільнай камісіі, акрамя асабістых прыёмаў грамадзян сенатары актыўна праводзяць прамыя тэлефонныя лініі, не змяншаецца і колькасць пісьмовых зваротаў.

— У камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы апошнім часам прыходзяць звароты, якія звязаны з новымі законапраектамі, што разглядаюцца ў Нацыянальным сходзе, — расказаў Сяргей Рачкоў. — Шэраг з іх мы ўхвалілі на мінулым тыдні, і звязаны яны з узмацненнем нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

У прыватнасці, людзей хвалюе законапраект аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму, закон аб супрацьдзеянні экстрэмізму, патлумачыў сенатар. Члены Савета Рэспублікі са свайго боку актыўна тлумачаць навелы, якія з'яўляюцца ў законах. Але, з яго пункту гледжання, новы законапраект аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму патрабуе больш сур'ёзнай інфармацыйнай работы.

— Вельмі шмат людзей падтрымліваюць тыя дзеянні, якія мы зараз рэалізоўваем, тыя даручэнні, якія дае Кіраўнік дзяржавы, — акцэнтаваў увагу старшыня профільнай камісіі. — Але ёсць і тыя, хто ставяць пад сумнеў некаторыя палажэнні законапраекта. Паступаюць звароты юрыстаў, што мы не ў поўнай меры выконваем міжнародныя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь.



Сяргей Рачкоў нагадаў, што ўсе законапраекты перад тым, як будуць разглядацца парламентарыямі, праходзяць абавязковую шматступенную экспертызу:

— Гаворка аб трох этапах юрыдычнай экспертызы, у тым ліку на адпаведнасць міжнародным абавязацельствам нашай краіны. Таму такія сцвярджэнні, як правіла, беспадстаўныя, — падкрэсліў ён.

Што датычыцца прыёмаў па асабістых пытаннях, тут пераважае праблематыка, звязаная з жыццёвымі праблемамі грамадзян.

— Мы вельмі ўважліва разглядаем усе звароты. У цэлым, павышэнне якасці работы са зваротамі грамадзян — павышэнне даверу да ўлады, і, адпаведна, гэта нас аб'ядноўвае ў Год народнага адзінства, — перакананы сенатар. — Мы імкнёмся дапамагаць там, дзе магчыма і ў межах закона.

Напрыклад, у Савет Рэспублікі звярнуўся Раман Алегавіч, які з'яўляецца сіратой і інвалідам трэцяй групы, з нагоды ўчынення ў адносінах да яго супрацьпраўных дзеянняў і непрыняцця па дадзеным факце мер рэагавання з боку дзяржорганаў. Пасля ўмяшання ў высвятленне ўсіх абставін справы старшыні профільнай камісіі былі накіраваны адпаведныя лісты ГУУС Мінгарвыканкама ў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама і пракуратуру Фрунзенскага раёна Мінска. Пытанне знаходзіцца на кантролі ў Савеце Рэспублікі.

І гэта не адзінкавы выпадак. Так, напрыклад, да сенатара звярнуліся жыхары вёскі Сялец, што ў Лідскім раёне, якія былі незадаволены якасцю праведзенага ў іх капітальнага рамонту. Пасля ўмяшання ў гэтую справу сенатара, у тым ліку дзякуючы асвятленню праблемы ў сродках масавай інфармацыі, усе недапрацоўкі былі выпраўлены.

Дарэчы, як падкрэсліў у гутарцы з журналістамі Сяргей Рачкоў, многіх людзей хвалююць пытанні добраўпарадкавання, рамонту дарог, жылога фонду.

— На вялікі жаль, па гэтай тэматыцы колькасць зваротаў не змяншаецца, а значыць, мясцовыя органы ўлады не заўсёды дакладна разбіраюцца ў сітуацыях. Такое стаўленне недапушчальнае, паколькі неабходна праяўляць самыя ўважлівыя адносіны да кожнага звароту, — падкрэсліў ён.

А апошні прыём па тэматыцы таксама быў разнастайны. Аляксандр Мікалаевіч прыехаў з Магілёва з просьбай пасадзейнічаць у аднаўленні на службе ў органах унутраных спраў. У свой час памыліўся, аб чым вельмі шкадуе. Ірына Уладзіміраўна з Бабруйска незадаволена вынесеным рашэннем суда ў дачыненні да яе сужэнца і прасіла старшыню звярнуць увагу на ход разгляду гэтай справы. Фёдар Іванавіч з Пухавіцкага раёна яшчэ ў 90-я гады мінулага стагоддзя страціў права ўласнасці на сталічную нерухомасць, а зараз імкнецца аднавіць справядлівасць. Былая мінчанка Таццяна Уладзіміраўна цікавілася працэсуальнымі момантамі праваахоўных арганізацый у адносінах свайго статусу. Усе пытанні будуць дасканальна вывучаны, заяўнікі атрымаюць вычарпальныя адказы на ўзнятыя пытанні.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

### ДАВЕДКА «МС»

Летась члены Савета Рэспублікі правялі 868 асабістых прыёмаў грамадзян, у тым ліку 415 выязных, 398 «прамых ліній», падчас якіх звярнуліся 2983 чалавекі. Усяго разгледжана 3967 пісьмовых зваротаў, у тым ліку членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі — 2559.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, членамі Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы разгледжана 784 звароты, праведзена 169 асабістых прыёмаў (у тым ліку 93 выязныя) і 81 прамая лінія.

Ужо сёлета ў першым квартале сенатары правялі 216 асабістых прыёмаў грамадзян, 97 «прамых ліній», на якія звярнуліся 747 чалавек. Усяго разгледжана 1197 пісьмовых зваротаў, сярод якіх 779 — членамі Прэзідыума.

## Сядзі і глядзі

# ВЯЛІКДЗЕНЬ У ТЭЛЕЭФІРЫ

**Тэлеканалы медыяхолдынга напярэдадні Светлага Хрыстовага Уваскрэсення, якое сёлета па календары праваслаўнай канфесіі адзначаецца 2 мая, прапаноўваюць вернікам некалькі прамых трансляцый святочных богаслужэнняў з беларускіх храмаў, а таксама пакажуць зварот да хрысціян прадстаяцеля Беларускай праваслаўнай царквы мітрапаліта Веніяміна і тэматычныя выпускі ўласных праектаў.**



У суботу 1 мая ў 8.30 госцем праекта «Сэнс жыцця» ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» стане лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» протаіерэй Алег Абрамовіч, а познім вечарам галоўны канал медыяхолдынга запрашае вернікаў разам сустрэць Вялікдзень і аб'яднацца ў малітве падчас прамой трансляцыі святочнага богаслужэння з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора. Узначаліць сакральную службу мітрапаліт Веніямін.

А святочнай нядзельнай раніцай у 6.05 на «першай кнопцы» ўладыка Веніямін звернецца да тэлеаўдыторыі са Словам на Светлае Хрыстова Уваскрэсенне. У эфіры сацыякультурнага тэлеканала «Беларусь 3» гледачоў будзе чакаць чарговы выпуск праграмы «Размовы пра духоўнае» ў 8.20, прысвечаны святу Вялікадня. Акрамя гэтага, у 15.40 на «Беларусь 1» зможам паназіраць за жыццём Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра, і дапаможа ў гэтым яго настаяцельніца ігумення Еўдакія ў праекце «Адзін дзень».

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 119

Наступная задача Чэслава Якубоўскага (*Мінск*) была адзначана пахвальным водгукам на міжнародным конкурсе складання *(гл. дыяграму)*.




**Белыя:** Крс1, Фh8, Лd4, Cb7, Cf2, Ка7, пп. а3, а5, с4 (9).

**Чорныя:** Крс5, Ке3, Kf3, пf4 (4).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі *(вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда»)* або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Разгледзім сумесную задачу Віктара Волчака і Чэслава Якубоўскага, якая атрымала першы ганаровы водгук на міжнародным конкурсе да 140-гадовага юбілею знакамітага чэшскага шахматнага кампазітара Міраслава Хавеля.

**Белыя:** Кра8, Фg2, Са2, Ка3, Kb7, пп. b2, c5, d4 (8).

**Чорныя:** Kpb4, Cd1, Ka5, Kg1, пп. a4, b5, c7, d6, e3 (9).

Мат за 3 хады.

1. Kd8! ~ 2. Фс6! ~ 3. Ф:b5х, 2...К:с6 3. К:с6х, 2...Cf3(Се2) 3. Кс2х, 1...Kf3 2. Фс2! ~ 3. Фс3х, 2...С:с2 3. К:с2х; 1...Ке2 2. Ф:е2! ~ 3. Ф:b5/Фе1х, 2...С:е2 3. Кс2х, 2...Кс4 3. Кс6х, 1... Cf3+ 2. Ф:f3! ~ 3. Кс2х, 2...Kb7 3. Кс6х (1...d5 2.Ф:g1! ~ 3. Фе1х, 2...Kb3(Кс4) 3. Кс6х). Ахвяры белага ферзя ў чатырох варыянтах.

* * *

Традыцыйны міжнародны шахматны турнір у Оршы (63 удзельнікі) выйграў беларускі гросмайстар Аляксей Аляксандраў. 2-4 месцы падзялілі Ганна Саргсян (*Арменія*), Вячаслаў Зарубіцкі (*Беларусь*) і Глеб Апрышка (*Расія*). Там жа адбыўся турнір з нормай міжнароднага майстра (10 удзельнікаў), дзе прызавую тройку склалі майстры ФІДЭ Дзмітрый Кананенка (*Украіна*), Мар'ям Мкртчан (*Арменія*) і Арцём Стрыбук (*Беларусь*).

У Чалябінску (97 удзельнікаў) Аляксей Фёдараў і Сяргей Азараў падзялілі 2—9 месцы (па дадатковых паказчыках яны, адпаведна, на пятым і восьмым месцах). Аляксей Аляксандраў фінішаваў на 24-м месцы, Вячаслаў Зарубіцкі — на 31-м.

Чэмпіёнамі Беларусі да 20 гадоў сталі Дзяніс Лазавік і Аляксандра Тарасенка. Падрабязнасці — у наступным выпуску.

* * *

Прапануем яшчэ дзве партыі з анлайн-турніру наймацнейшых гросмайстраў, пра якія мы распавядалі ў мінулым выпуску.

Ян Няпомняшчы — Хікару Накамура. 1. е4 е5 2. Kf3 Кс6 3. Cb5 Kf6 4. 0-0 К:е4 5. d4 Kd6 6. С:с6 dc 7. de Kf5 8. Ф:d8+ Кр:d8 9. Кс3 Кре8 10. h3 Се6 11. g4 Ке7 12. Kd4 Cd7 13. f4 h5 14. f5 hg 15. е6 fe 16. fe Сс8 17. Cg5 gh 18. Kph2 Kg6 19. Ке4 Лh5 20. Лg1 а6 21. Лad1 Ке7 22. Лdf1 с5 23. Л:f8+, 1:0.

Уэслі Со — Аніш Гіры. 1. d4 Kf6 2. с4 g6 3. Кс3 d5 4. Cf4 Cg7 5. е3 0-0 6. Лс1 Се6 7. с5 с6 8. Cd3 Cg4 9. Kge2 b6 10. Ка4 Kfd7 11. f3 е5 12. С:е5 К:е5 13. de Сс8 14. f4 f6 15. ef Ф:f6 16. 0-0 Фе7 17. Фd2 Ле8 18. Лf3 Cg4 19. Лg3 С:е2 20. С:е2 Kd7 21. b4 Kf6 22. Кс3 bc 23. bc Лad8 24. f5 gf 25. Лf1 Ке4 26. К:е4 fe 27. Cg4 Лf8 28. Cf5 Лf6 29. Фе2 Фf7 30. Фg4 Лf8 31. Лf2 Kph8 32. Се6 Фе7 33. Cf5 Ch6 34. Лh3 Фе5 35. Лf1 Л:f5 36. Л:f5 Л:f5, 0:1.

* * *

Прааналізуем задачу з мінулага выпуску. Напачатку гатова так званая ілюзорная гульня: 1...Kd~ 2. Л:d4х Не вядуць да мэты падманныя сляды: 1. Фс8? (пагроза 2. Фс2х) Kb4/c3/e3 2. Фс3/:с3/с3х, але 1... Кс7! і 1. Фе8? (пагроза 2. С:е2х) Кс3/е3/f4 2. Фе3/:е3/е3х, але 1...Ке7! Рашае 1. Ле6! (пагроза 2. С:е2х) Кс3/е3/f4, Ке4, Се4 2. Ле3/:е3/е3, С:е4, С:е4х Па аўтарскай задуме, змест задачы складае чатырохразовая перамена матаў, ускладненая шэрагам тактычных момантаў. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



# Што «барометру» рабіць на сотках?

**З прыходам вясны ў дачнікаў пачынаецца новы сезон, а значыць, па традыцыі і праект «Тэлебарометр», што выходзіць на «Беларусь 2», працягвае знаёміць тэлегледачоў з карыснымі дачнымі лайфхакамі, цікавымі гасцямі і актуальнымі метэапрагнозамі.**



Атмасфера Цэнтральнага батанічнага саду сталіцы — самае спрыяльнае месца для сустрэч і размоў пра надвор'е. Менавіта тут вядучы праграмы сустракаецца з гасцямі, для якіх кліматычныя змены і праблемы навакольнага асяроддзя з'яўляюцца важнымі тэмамі. У найбліжэйшых выпусках гасцямі «Тэлебарометра» стануць дачнікі-энтузіясты і садаводы-аматары, якім ёсць чым падзяліцца.

Ні для кога ўжо не сакрэт, што для людзей самых розных прафесій лецішча стала сапраўдным «месцам сілы». І зусім хутка запрошаныя госці праекта раскажуць пра «міфалагічныя» сарты вінаграду «Юпітэр» і «Афрадыта», а таксама падзеляцца ведамі адносна таго, з якога боку ўчастка лепш прыжываюцца грэцкі арэх, цюльпан ці персікавае дрэва. А яшчэ, напрыклад, як уласнымі рукамі зрабіць арыгінальную альпійскую горку. Па-ранейшаму не абмінуць увагай у праграме і пытанні мікраклімату, бо, як вядома, нават блізкі вадаём можа паўплываць на ўраджайнасць вашых сотак. Так, адным з гасцей праграмы 2 мая стане даследчык гідрасферы і раскажа гісторыю будаўніцтва Вілейскага вадасховішча, дзе пры першым напаўненні можна было злавіць 40 шчупакоў за адну рыбалку. Даведаемся і пра з'яўленне Камсамольскага возера ў Мінску, што адбылося якраз з-за ўплыву надвор'я і як возера папярэджвае паводку Свіслачы.

Стваральнікі «Тэлебарометра» імкнуцца падтрымліваць зваротную сувязь з аўдыторыяй у сацыяльных сетках. Калі ёсць жаданне абмеркаваць дачныя пытанні з вядучым праграмы Дзмітрыем Карасём, можна запісаць відэазварот ці падзяліцца ўласнымі дасягненнямі, сакрэтамі па высаджванні расады, абрэзцы дрэў і г. д. Рэдактары праграмы заўважаюць, што гэтая інтэрактыўная рубрыка становіцца папулярнай не толькі сярод дачнікаў, але і студэнтаў, школьнікаў па ўсёй краіне, бо маладыя людзі таксама занепакоены праблемамі навакольнага асяроддзя, іх цікавяць анамаліі надвор'я, тэмы, звязаныя з псіхасаматыкай, астраноміяй і іншымі з'явамі ў прыродзе. Нагадаем, што «Тэлебарометр» выходзіць на сустрэчу з гледачамі па нядзелях у вячэрнім эфіры на «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.**

# Веды вырашаюць не ўсё...

**Інтэлектуальна-забаўляльная шоу-віктарына «Вежа» (выходзіць на «Беларусь 2») адзначыла свой першы дзень нараджэння.**
**За 12 месяцаў эфірнага жыцця ў 52 праграмах змагаліся 312 гульцоў са 104 каманд, а вядучы праекта Васіль ЧЭХАЎ задаў ім больш за тысячу пытанняў рознай складанасці.**

Добры гумар і магчымасць праверыць свае веды альбо даведацца штосьці новае забяспечыла шоу інтарэс усіх без выключэння: і гульцоў, і гледачоў, і нават яго аўтараў. Тут было цікава назіраць за напалам спаборніцтва як у кадры, так і на здымачнай пляцоўцы.

— За два сезоны нашага праекта было пабудавана, хоць і не заўсёды ўдала, 208 вежаў. Але важна памятаць, што асаблівасць праграмы ў тым, што веды не заўсёды даюць шанц на перамогу, бо не менш важныя фактары — шанцаванне, тактыка і хуткасць, а ў выніку ўсё вырашае «Вежа», — дзеліцца **выканаўчы прадзюсар «Беларусь 2» Ягор ШОЛЬКІН.** — Таму толькі сем каманд-удзельніц атрымалі перамогу і змаглі выйграць галоўны прыз — сертыфікат на вандроўку да адной з вядомых веж свету.

Стваральнікі праекта плануюць зрабіць трэці, новы, сезон яшчэ больш маштабным, тэхналагічным і яркім, каб жаданне развівацца ды гуляць інтэлектуальна і весела ў беларусаў не знікала. Чарговыя выпускі шоу «Вежа» глядзіце па нядзелях у 17.30.



**Алена ДРАПКО.**

# пятніца, 7 мая



## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 11.50, 12.10, 13.05 Ваенна-шпіёнскі дэтэктыў «СМЕРШ. Паміраць загаду не было». (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Меладрама «Скажы праўду» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**18.40** «Фарпост памяці». Спецыяльны рэпартаж АТН (12+).
**19.20** Урачысты сход і канцэрт майстроў мастацтваў «Дзякуй за жыццё!»
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.50 Кінааповесць «У тумане» (12+).**
**1.10** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00. 16.30** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00** «На нажах» (16+).
**11.00. 18.25 Серыял «Ускрыццё пакажа» (16+).**
**12.45** «Тры першыя спатканні» (16+).
**13.30** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.05** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.35 «Клон». Серыял (16+).**
**17.30** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**20.15** «Вежа» (12+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.25 Баявік «Аперацыя «Тайфун». Заданне асаблівай важнасці». 1—4-я серыі (12+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Трабух.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.20** Навіны культуры.
**8.25, 17.35 «Дом з лілеямі». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**10.20** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**10.35, 15.40 «Праверана — міняма». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Паляндвіца па-гусарску.
**12.50** «Сіла веры».
**13.15, 21.05** «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
**14.05, 21.55 «Балада пра бомбера». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**15.00** Харавое свята «Спявай, мая сталіца!»
**17.05** «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам. Тэлемасты.
**19.30** «Штурман журналістыкі. Да 100-годдзя Рыгора Булацкага». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Нататкі на палях». Іван Шамякін: трывожнае шчасце пісьменніка [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету.
**9.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ.
**13.05** Тэніс. WTA.
**15.10** Хакей для ўсіх.
**15.45** Вось гэта спорт!
**16.05** Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
**16.40, 18.55** Спорт-цэнтр.
**16.50, 23.50** Валейбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2021. Мужчыны. Партугалія — Беларусь.
**19.05** Авертайм.
**19.40** Муай-тай. Чэмпіянат Беларусі. Фіналы.
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Ньюкасл». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
**10.00** «На дачу!» (6+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Вялікая Перамога» (16+). Фільм пяты.
**13.15 «Нішто не здараецца двойчы». Серыял (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45, 18.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Неапалімая Купіна» (16+).**
**23.10** «Што? Дзе? Калі?» ў Беларусі. Вясновая серыя гульняў (16+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 20.45, 1.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Ленінград 46». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00 Серыял «Мама-дэтэктыў» [СЦ] (16+).**
**8.40, 10.20 Серыял «Мар'ін гай-2» [СЦ] (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.20 Маст. фільм «Моцны арэшак».**
**19.15** «Слабае звяно» (12+).
**20.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00 Серыял «Бітва за Маскву». 1—4-я серыі (12+).**
**3.30 Маст. фільм «Ляцяць жураўлі» (12+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Сто да аднаго» (16+).
**12.20** «Зроблена». Дакументальны праект.
**12.40 Драма «У чэрвені 41-га» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 17.00 Серыял «Суседзі. Новыя серыі» (12+).**
**18.00** «Ізмайлаўскі парк» (12+).
**21.00, 23.10 Серыял «Паромшчыца» (12+).**
**0.10 Серыял «Скажы праўду» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.50, 8.15, 16.15, 19.20, 21.45, 23.15** Сёння. Галоўнае.
**6.15** «Беларусы» (6+).
**7.05** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.35** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.50** «Навукаманія « (6+).
**9.25, 21.50** «НЗ.by».
**9.50, 10.15 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**11.00 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).**
**13.00 Серыял «Ліцейны» (16+).**
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.20** «Незабыты подзвіг». Хранікальна-дакументальны тэлефільм (12+).
**16.40** «ДНК» (16+).
**17.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.35 Дэтэктыў «Бухта глыбокая» (16+).**
**22.20, 23.30 Маст. фільм «У жнiўні 44-га...» (16+)**
**0.40** Дак. цыкл «Вечная Айчынная» (12+).

## 8 канал

**7.00, 15.20, 19.40, 21.00, 1.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.25** «Мультпарад».
«Шчанячы патруль» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.15 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.45** «Дакументальны экран» (12+).
**10.15 Камедыя «Дзень радыё» (16+).**
**12.00 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**13.40 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**16.45, 20.45 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).**
**16.50** «Гатуй як шэф» (12+).
**17.05 Серыял «Гістарычны дэтэктыў». «Таямніца Луўра» (12+).**
**18.35 Серыял «Дзеля ўсяго чалавецтва» (12+).**
**19.45 Серыял «Эмілі ў Парыжы» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.05** «Героі коміксаў на экране» (12+).



# серада, 5 мая



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.20** Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45, 17.25, 21.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**12.20** «Лаві момант» (16+).
**13.15, 2.55** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 2.00** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**18.30, 3.50** Серыял «Усход-Захад» (16+).
**20.30** Серыял «Бацькам» (16+).
**23.00** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Серыял «90-я. Весела і моцна» (16+).
**1.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**5.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Дзюймовачка». М/ф.
**7.10** «Пешшу...» Масква шпацырная.
**7.40, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10, 18.50, 23.35** «Нотр-Дам-дэ-Пары: выпрабаванне часам». Дакументальна-анімацыйны фільм [СЦ].
**9.00, 16.30** «Дзень за днём». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.30** ХХ стагоддзе. «Уладзімір Этуш. Юбілейны вечар».
**12.00** «Араніенбаумскія гульні». Дак. фільм.
**12.40** «Родная». Маст. фільм [СЦ].
**14.20** Больш, чым каханне. Вольга Бергольц і Барыс Карнілаў [СЦ].
**15.00** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.15** «Біблейскі сюжэт».
**15.45** «Белая студыя».
**17.40** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.55, 1.15** Да 90-годдзя з дня нараджэння Генадзя Раждзественскага. А. Шнітке. Concerto grosso F — гроса № 2 для скрыпкі і віяланчэлі з аркестрам. Алег Каган, Наталля Гутман і Дзяржаўны сімфанічны аркестр Міністэрства культуры СССР.
**18.35** «Забытае рамяство». Дак. серыял. «Лоўчы».
**19.45** «Галоўная роля».
**20.40** Да 80-годдзя Камы Гінкаса. «Падарожжа да пачатку жыцця». Дак. фільм [СЦ].
**21.20** Улада факту. «Распад Брытанскай імперыі».
**22.05** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял [СЦ].
**23.05** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял. [СЦ].
**1.55** «Адчувальны дар. Уладзімір Баравікоўскі». Дак. фільм.
**2.35** «Як адзін мужык двух генералаў пракарміў». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Саша. Лета». 2020 год. Памяці Аляксандра Ліпніцкага (18+).
**7.20, 8.35, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30,13.50** Маст. фільм «Сын» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Масканцэрт — галоўны манапаліст у СССР». 2006 год (16+).
**13.05** Кінаканцэрт «Па старонках амерыканскага кіно». 1991 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**19.00** Маст. фільм «Дамы ўдаўца» (16+).
**23.20** Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа». 1-я частка. 2011 год (16+).
**0.00** Маст. фільм «Нябесны ціхаход». (12+).
**1.50** Канцэрт гурта «Пушкинг». «Рок-н-рол — гэта «Pushking». 2004 год (12+).
**4.00** Маст. фільм «Патрэбныя людзі» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 3.00, 6.00, 9.30, 20.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» — 2020 (12+).
**1.00** Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
**2.30, 11.30, 15.30, 22.00** Веласпорт. Чатыры дні Дзюнкерка (12+).
**4.00, 8.00** Снукер. UK Championship (6+).
**10.30, 23.30** Ралі. ERC. Тэлечасопіс All Access (12+).
**12.30** Веласпорт. «Тур Рамандыі» (12+).
**13.30** Аўтагонкі. Формула Е. Агляд (12+).
**14.30** Аўтагонкі. World Endurance. «6 гадзін Спа» (12+).
**18.00** Веласпорт. «Тур Алгарве».
**19.30** Аўтагонкі. Формула Е. Агляд (12+).
**23.00** Алімпійскія гульні. Надзя Каманечы vs Сімона Байлз (12+).

## Кінакамедыя

**1.05, 10.05 2** + 1 (16+).
**3.30** Робін Гуд: пачатак (16+).
**5.35** Зялёная кніга (16+).
**8.00** 1 + 1 (16+).
**12.15** Сакавіцкія каты (16+).
**14.05** Спадарыня пакаёўка (12+).
**16.00** Бандыткі (16+).
**17.40** Як украсці брыльянт (16+).
**19.30** Практычная магія (16+).
**21.25** Суседка (16+).
**23.25** Хлопчык у дзяўчынцы (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.50** «Перыскоп» (16+).
**10.10, 15.50, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.10, 3.40** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.50, 2.45** «Сляпая» (16+).
**13.10, 19.55** «Варажбітка» (16+).
**14.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.15** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.55** «Ганна-дэтэктыў». Серыял (16+).
**21.00** «Добры доктар». Серыял (16+).
**22.45** «Грым». Серыял (16+).
**23.40** «Глядзі сам» (16+).
**23.55** «10 самых» (16+).
**0.30** «Лінія абароны» (16+).
**1.05** «На мяжы». Маст. фільм (16+).

## ТБ1000

**5.00, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.45** Гульні розумаў (16+).
**8.50** Мірны воін (12+).
**10.55** Ніколі не здавайся (16+).
**12.55** Малая на мільён (16+).
**15.15** Прыстанак праклятых (16+).
**19.00** Місія: невыканальная (12+).
**20.55** Місія: невыканальная-2 (12+).
**23.10** Місія: невыканальная-3 (12+).
**1.15** Ацалелая (16+).
**2.45** Пітэр Пэн (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.40** Той яшчэ..! (12+)
**8.35** Легенда № 17 (12+).
**10.55** Вікінг (12+).
**13.20, 19.00** Шэрлак у Расіі (18+).
**15.15** Пяць нявест (16+).
**17.15** Паспех (12+).
**21.00** Ярды (16+).
**22.35** Зорка (16+).
**0.55** Статус: вольны (16+).
**3.00** Метро (16+).

## National Geographic

**6.30** Золата Юкана (16+).
**7.20** Цуды інжынерыі (16+).
**8.10, 9.55** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.05** Суперкар са сметніка (16+).
**10.45, 12.30, 16.45, 22.35** Аўта-SOS (16+).
**11.40, 3.15** Асушыць акіян (16+).
**3.20** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**14.15** Космас: прастора і час (16+).
**15.05, 19.15, 1.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.35** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.25** Фабрыка ежы (16+).
**21.00, 2.30** Непакорлівы востраў (16+).
**21.45** Вострaў бунтароў (16+).
**23.30** Інстынкт выжывання (16+).
**0.20** Ліхтургі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**1.55** Апакаліпсіс: вайна светаў (16+).
**4.00** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**4.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**5.35** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 20.24, 5.45** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32,15.00, 21.18** Як гэта зроблена? (12+)
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Разбуральнікі легенд: спецвыпуск (12+).
**13.12, 7.15** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (16+).
**14.06, 6.30** Штаб-кватэры Гітлера (16+).
**15.54** Музейныя загадкі (12+).
**18.36, 2.40** Смяротны ўлоў (16+).
**19.30, 4.15** Мяцежны гараж (12+).
**23.06** Сябры-скрабашукальнікі (12+).
**0.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**0.54** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**3.30** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Ваенна-шпіёнскі дэтэктыў «СМЕРШ. Камера смяротнікаў» (16+).**
**13.55** «Здароваздаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Меладрама «Скажы праўду» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.25** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Адзін дзень (12+).
**0.05** Сфера інтарэсаў.
**0.45** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00. 16.30** Тэлебарометр.
**9.05. 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00. 22.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00. 18.20 Серыял «Ускрыццё пакажа» 16+).**
**12.45** «Да пабачэння» (16+).
**13.30** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.05. 17.30** «Арол і рэшка. Маркі сезон» (16+).
**15.00** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.35 «Клон». Серыял (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.25** «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
**23.35 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Жулікі па-далецку.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.15** Навіны культуры.
**8.25, 18.00 «Дом з ліліямі». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**10.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.40, 16.15 «Смага». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Рагойш.
**12.50** «Люблю і памятаю». Народны артыст СССР Леў Дураў.
**13.25, 21.05** «Вялікая вайна».
Дак. драма (12+).
**14.15, 21.55 «Балада пра бомбера». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**15.10** «Джо Дасэн. Вечнае каханне». Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга.
**17.35** «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам. Рэжысёр Уладзімір Ісат.
**19.55** «Арт-гісторыі». Партрэт «краіны-фронта» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Нататкі на палях». Янка Брыль: лёс марпеха [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Іслач» (Мінскі р-н) — «Шахцёр» (Салігорск).
**9.05, 14.00** Тэніс. WTA.
**11.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Чэлсі» (Англія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**13.05** Слэм-данк.
**13.40** Вось гэта спорт!
**16.00** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — БАТЭ (Барысаў).
**18.00** Між іншым.
**18.20** Хакей для ўсіх.
**18.55, 21.40** Спорт-цэнтр.
**19.05** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**21.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/2 фіналу. Матч у адказ. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.40** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «На дачу!» (6+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20 «Вялікая Перамога» (16+). Фільм чацвёрты.**
**13.15 «Нішто не здараецца двойчы». Серыял (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 23.50** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.50 Серыял «Неапалімая Купіна» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20, 20.45, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Ленінград 46». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00, 3.00 Серыял «Мамадэтэктыў» [СЦ] (16+).**
**8.45, 10.10, 23.30, 0.10 Серыял «Мар'ін гай-2» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**18.05** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (12+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Парад гумару» (12+).
**12.40 Драма «У чырвені 41-га» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 17.00 Серыял «Суседзі. Новыя серыі» (12+).**
**18.00** «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
**21.00, 23.10 Серыял «Паромшчыца» (12+).**
**0.10 Серыял «Скажы праўду» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 6.50, 8.15, 16.15, 19.20, 21.45, 23.15** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Беларусы (6+).
**7.05** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.35** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.50** «Навукаманія» (6+).
**9.25, 21.50** НЗ.by.
**9.50, 10.15 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**11.00 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).**
**13.00 Серыял «Ліцейны» (16+).**
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.20** «Вяртанне анёла». Хранікальна-дакументальны тэлефільм АТН (12+).
**16.50** «ДНК» (16+).
**17.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.35 Дэтэктыў «Бухта глыбокая» (16+).**
**22.05, 23.30 Маст. фільм «Эксперт» (16+).**
**0.40** Дак. цыкл «Вечная Айчынная» (12+).

## 8 канал

**7.00, 15.40, 18.25, 21.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.50** «Мультпарад». «Шчанячы патруль» (0+).
**7.30, 15.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.15 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.45** «Дакументальны экран» (6+).
**10.30 Трылер «Маркотныя ілюзіі» (16+).**
**12.20 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**14.00 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**16.55 Серыял «Гістарычны дэтэктыў». «Таямніца Вандомскай плошчы» (12+).**
**18.35 Серыял «Дзеля ўсяго чалавецтва» (12+).**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**19.50 Серыял «Эмілі ў Парыжы» (16+).**
**20.50 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Фантастыка «Які бяжыць у лабірынце» (16+).**
**1.10** «Надвор'е».



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.20** Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
**10.45, 17.25, 21.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**12.20** «Лаві момант» (16+).
**13.15, 2.25** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 1.30** Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
**18.30, 3.25** Серыял «Усход-Захад» (16+).
**20.30** Серыял «Бацькам» (16+).
**23.00** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Серыял «90-я. Весела і моцна» (16+).
**0.30** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**4.50** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Кот Леапольд». М/ф.
**7.10** «Пешшу...» Масква барочная.
**7.40, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10, 18.50, 23.35** «Нотр-Дам-дэ-Пары: выпрабаванне часам». Дакументальна- анімацыйны фільм [СЦ].
**9.05, 16.30** «Дзень за днём». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.30** XX стагоддзе. «Нататкі да мінулага. Яўген Халдэі». Дак. фільм.
**12.15** Раман у камені. «Іспанія. Тэруэль». Дак. фільм.
**12.45** «Пад знакам Чырвонага Крыжа». Маст. фільм.
**14.20** Больш, чым каханне. Юрый Нікулін і Таццяна Пакроўская [СЦ].
**15.00** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.15** Пернікавы домік. «Майстры Паўночнай Асеціі» [СЦ].
**15.45** «2 Вернік 2». Леанід Ярмольнік.
**17.35** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.55, 1.35** Да 90-годдзя з дня нараджэння Генадзя Раждзественскага. П. І. Чайкоўскі. Канцэрт № 2 для фартэпіяна з аркестрам. Вікторыя Постнікава і Дзяржаўны сімфанічны аркестр Міністэрства культуры СССР.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.40** Кіно пра кіно. «Ляцяць жураўлі». Жураўлікі-караблікі ляцяць пад небам». Дак. фільм [СЦ].
**21.20** «Энігма. Андрэй Канстанцінаў. Цэрамквартэт».
**22.05** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял [СЦ].
**23.05** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял [СЦ].
**2.30** «Містар Пронька». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Масканцэрт — галоўны манаполіст у СССР». 2006 год (16+).
**7.05** Кінаканцэрт «Па старонках амерыканскага кіно». 1991 год (12+).
**7.50, 1.30** Маст. фільм «Сын» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.00, 14.40, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 1.20, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**13.00** Маст. фільм «Дамы ўдаўца» (16+).
**17.20, 23.20** Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа» (16+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Анатоль Лук'янаў. 2007 год (16+).
**18.55** Маст. фільм «Дзве сястры». (16+).
**20.00** Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс». 1980 год (12+).
**0.00** «Саша. Лета». 2020 год. Памяці Аляксандра Ліпніцкага (18+).
**5.20** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 3.00, 6.00, 9.30, 20.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» — 2020 (12+).
**1.00** Снукер. UK Championship (6+).
**2.30, 11.30, 15.30, 22.00** Веласпорт. Чатыры дні Дзюнкерка (12+).
**4.00, 8.00** Снукер. Scottish Open (6+).
**10.30, 14.30, 23.30** Ралі. ERC. Тэлечасопіс All Access. Агляд (12+).
**12.30, 18.00** Веласпорт. «Тур Алгарве» (12+).
**13.30, 19.30** Аўтагонкі. Формула Е. Гран-пры Рыма. Агляд (12+).
**23.00** Алімпійскія гульні. Карл Льюіс vs Усэйн Болт (12+).

## Кінакамедыя

**1.10** Джэй і Маўклівы Боб наносяць удар у адказ (16+).
**2.55** Споведзь невідзімкі (12+).
**4.40** Фанфан-цюльпан (12+).
**6.30** Вялікі тата (12+).
**8.10** Хлопчык у дзяўчынцы (16+).
**9.55** Спадарыня пакаеўка (12+).
**11.55** Суседка (16+).
**13.50** Чатыры пакоі (18+).
**15.40** Практычная магія (16+).
**17.40** Ходзяць чуткі (12+).
**19.30** Маска (12+).
**21.20** Целаахоўнік Тэс (12+).
**23.10** Як украсці брыльянт (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45, 23.40** «Улегцы» (12+).
**10.15, 15.55, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.15** «Паралельны свет» (12+).
**12.10, 18.50, 3.05** «Сляпая» (16+).
**13.15, 19.55, 4.00** «Варажбітка» (16+).
**14.20** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.20** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.55** «Ганна-дэтэктыў». Серыял (16+).
**21.00** «Добры доктар». Серыял (16+).
**22.45** «Грым». Серыял (16+).
**0.15** «Знак якасці» (16+).
**1.00** «Прэстыж». Маст. фільм (12+).

## ТБ1000

**5.00, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.45** Малая на мільён (16+).
**9.05** Пітэр Пэн (12+).
**10.55** Місія: невыканальная (12+).
**12.55** Місія: невыканальная-2 (12+).
**15.05** Місія: невыканальная-3 (12+).
**19.00** Місія невыканальная: пратакол Фантом (12+).
**21.20** Місія невыканальная: племя ізгояў (16+).
**23.40** Місія невыканальная: наступствы (16+).
**2.40** Мірны воін (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30, 0.10** Землятрус (12+).
**7.30** Зорка (16+).
**9.40** Ярды (16+).
**11.20** Поспех (12+).
**13.05, 19.00** Шэрлак у Расіі (18+).
**15.05** Канікулы прэзідэнта (16+).
**16.55** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**21.00** Нерэальнае каханне (12+).
**22.30** Хатабыч (16+).
**1.55** Экіпаж (6+).
**4.05** Вікінг (12+).

## National Geographic

**6.00, 23.30** Інстынкт выжывання (16+).
**6.40** Залата Юкана (16+).
**7.25** Цуды інжынерыі (16+).
**8.20, 10.00** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.10** Суперкар са сметніка (16+).
**10.55, 22.40** Аўта-SOS (16+).
**11.45, 3.20** Асушыць акіян (16+).
**12.40, 16.45** Непакорлівы востраў (16+).
**13.25** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**14.15** Космас: прастора і час (16+).
**15.05, 19.15, 1.10, 2.30** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**17.35** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.25** Фабрыка ежы (16+).
**21.50** Злавіць кантрабандыста (16+).
**0.20** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**1.55** Апакаліпсіс: вайна светаў (16+).
**4.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**4.55** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**5.35** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 5.45** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Як гэта зроблена? (12+)
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Разбуральнікі легенд: кастынг (16+).
**13.12, 7.15** Голыя і напалоханыя (16+).
**14.06** Сталёвыя хлопцы (12+).
**15.54, 1.47** Музейныя загадкі (12+).
**18.36, 2.40** Смяротны ўлоў (16+).
**20.24** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**23.06** Сябры-скарбашукальнікі (12+).
**0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**0.54** Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
**3.30** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+)
**6.30** Голыя і напалоханыя XL (16+).

# КАДРЫ: ПРАЦЯГ ТЭМЫ

## Мясцовая ўлада і працоўныя рэсурсы

**Грунтоўная размова пра асаблівасці чалавечага капіталу краіны і ролю мясцовых уладаў у рацыянальным выкарыстанні працоўных рэсурсаў рэгіёнаў адбылася на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі на базе Мінскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа. Асноўным пытаннем стала абмеркаванне развіцця сістэмы прафесійнай адукацыі і павышэння прэстыжу рабочых прафесій у кантэксце праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.**



### Адукацыя плюс вытворчасць

Падчас дыскусіі суразмоўцы пастаянна закраналі практычныя аспекты ажыццяўлення кадравай палітыкі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Выснова: кадраў не хапае ў розных сферах дзейнасці, праблему трэба вырашаць як мага хутчэй. Улічваючы яе вялізарную актуальнасць, нагадаем вельмі тыя асобныя моманты размовы, якія ў большай ступені датычыліся дзейнасці органаў мясцовых уладаў. Бо актуальнасць пытання, як гаварылі ўдзельнікі пасяджэння, узрастае з кожным днём. Напрыклад, толькі на мінскім ААТ «Камволь» дэфіцыт спецыялістаў у пэўнай ступені стрымлівае развіццё вытворчасці.

І ўвогуле рэдкі кіраўнік вялікага ці сярэдняга прадпрыемства на пытанне аб тым, што замінае паспяховай рабоце калектыву, не спашлецца на часам хранічны недахоп кваліфікаваных рабочых кадраў. Іх у краіне рыхтуе сістэма прафесійнай адукацыі, але ці ўсё залежыць толькі ад яе? Відавочна: калі не ўсё, то вельмі многае. Навуковае тлумачэнне кадравага дэфіцыту даў **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** На яго погляд, сёння не пытанне падрыхтаваць неабходную колькасць спецыялістаў. Магутнасці, так бы мовіць, айчыннай адукацыйнай сістэмы дазваляюць гэта зрабіць. Дык у чым тады справа?



А сутнасць няпростай кадравай праблемы ў тым, што колькасць навучэнцаў у сярэдніх школах Беларусі пачала ўзрастаць толькі з 2014 года. Гэта значыць, што і колькасць выпускнікоў 11 класаў павялічыцца толькі ў 2025 годзе. Таму пакуль на рынак працы з устаноў адукацыі ўсіх узроўняў выходзіць усё менш выпускнікоў. Але, між іншым, нагадаў Валерый Галубоўскі, і ў савецкія часы сістэма адукацыі не вырашала цалкам усю патрэбу эканомікі ў кадрах. Таму неабходна знайсці кадравы баланс на рынку працы паміж попытам і прапановай. Дасягнуць гэтага можна за кошт развіцця прафесійнай мабільнасці на аснове павышэння кваліфікацыі работнікаў, выбудовы стратэгіі перанавучання дарослых, беспрацоўных, засваення прафесійнай дыягностыкі з мэтай выяўлення недахопаў у патэнцыяльных кадрах і г. д., лічыць рэктар.

І цяжка не пагадзіцца. Але, як адзначалася на пасяджэнні, сёння таксама важна кантраляваць своечасовае, а часам і апераджальнае навучанне і перанавучанне работнікаў прадпрыемстваў ва ўмовах мадэрнізацыі вытворчасці, укаранення інавацыйных праектаў. Каб потым не шукаць у экстранным парадку кваліфікаваныя кадры.

На тым, як супрацьстаяць гэтай праблеме на «Амкадоры», засяродзіў увагу ў сваім выступленні яго **генеральны дырэктар Аляксандр ЯФІМАЎ.** А дакладней, ён спыніўся на тэме ўзаемадзеяння навучальных устаноў з прадпрыемствамі-заказчыкамі кадраў, укараненні практыка-арыентаванага навучання. У холдынгу яшчэ напрыканцы 2006 года быў адкрыты цэнтр навучання і развіцця персаналу ў адпаведнасці з дзелавымі інтарэсамі «Амкадора». З гэтай нагоды актывізавалася супрацоўніцтва з установамі адукацыі, з якімі холдынг заключае дагаворы, на прадпрыемстве створаны чатыры філіялы кафедраў вядучых ВНУ краіны. І такія намаганні прыносяць плён.

**Генеральны дырэктар МАЗа Валерый ІВАНКОВІЧ** таксама ўпэўнены ў тым, што кадравае забеспячэнне прамысловых прадпрыемстваў становіцца пытаннем першачарговай важнасці. Рабатызацыя, лічбавізацыя і ўкараненне новых тэхналагічных укладаў вымушае зусім па-іншаму рыхтаваць спецыялістаў. А ўзаемадзеянне з установамі адукацыі ўсіх узроўняў з'яўляецца адзіным лагічным выйсцем. На базе аўтамеханічнага каледжа, які знаходзіцца літаральна праз дарогу ад МАЗа і рыхтуе кваліфікаваныя кадры для славутага завода, створаны ўнікальны навучальны цэнтр вытворчых тэхналогій. Вось яна, жывая сувязь паміж адукацыяй і вытворчасцю, з гонарам гаворыць Валерый Іванковіч.

Чую пярэчанне: «Дык гэта ж МАЗ і «Амкадор», у іх такія фінансавыя і іншыя магчымасці, яны могуць сабе дазволіць цэнтры адкрываць!» Згодны. Але, з іншага боку, «Амкадор» сумесна з Мінгарвыканкамам ажыццявіў пілотны праект па перанавучанні групы беспрацоўных складаным новым спецыяльнасцям менавіта для вытворчасці завода. Так што галоўнае —жаданне, а спосабы вырашэння праблемы знайсці можна.

### Падводныя рыфы прафарыентацыі

Зайшла размова аб павышэнні ролі мясцовых уладаў у падрыхтоўцы і выкарыстанні працоўных рэсурсаў рэгіёнаў, замацаванні кадраў на месцах. **Старшыня Лідскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК** падзяліўся цікавымі назіраннямі аб нюансах прафарыентацыі ў раённых школах. Па яго словах, правільная прафарыентацыя — гэта інвестыцыі ў будучыню раёна. Але пераважная частка дырэктараў школ і настаўнікаў, на жаль, знаходзяцца нібы ў палоне старых уяўленняў аб лёсе выпускнікоў: вельмі жадаюць іх паступлення ў ВНУ. Чым больш туды паступае іх выхаванцаў, тым вышэйшы негалосны рэйтынг настаўніка. Таму і матывуюць вучняў старэйшых класаў на атрыманне вышэйшай адукацыі, а не на авалоданне рабочымі прафесіямі. Ды і бацькі арыентуюць падлеткаў пераважна на ВНУ. Вось і атрымліваецца, што кадры патрэбны ў раёне, а моладзь імкнецца на вучобу ў Мінск і абласныя цэнтры. Трэба пазбаўляцца састарэлых стэрэатыпаў аб вышэйшай адукацыі як аб выключным шчаслівым білеце ў прыгожую заможную будучыню, гаворыць Сяргей Ложачнік.

Думаецца, педагогам не толькі сельскіх школ варта звярнуць увагу на выказанае падчас пасяджэння меркаванне **міністра адукацыі Ігара КАРПЕНКІ:** у краіне яшчэ недастаткова выкарыстоўваюцца магчымасці і перавагі мэтавай падрыхтоўкі рабочых кадраў. Для гэтага трэба больш актыўна ўзаемадзейнічаць са школамі, шукаць і знаходзіць юнакоў і дзяўчат, матываваных працаваць у рэальным сектары эканомікі. А для гэтага неабходна ранняя прафарыентацыя ў школах, лічыць міністр.

У гэтым сэнсе апошнім часам добра сябе зарэкамендавалі профільныя класы аграрнай накіраванасці. Іх досвед, праблемы і перспектывы ўсё часцей абмяркоўваюцца на розных канферэнцыях і семінарах прафесіяналаў адукацыі з удзелам практыкаў і прадстаўнікоў органаў мясцовых улад. Сёння ў школах Беларусі адкрыты прыкладна 400 профільных аграрных класаў. Дзякуючы ім старшакласнікі маюць магчымасць на свае вочы ўбачыць рэальныя ўмовы працы ў сельскай гаспадарцы, выбраць там будучую прафесію і ў рэшце рэшт застацца працаваць на зямлі. Нямала выпускнікоў такіх класаў потым паступаюць у аграрныя вучэбныя ўстановы.

> Кадраў не хапае ў розных сферах дзейнасці, праблему трэба вырашаць як мага хутчэй.

Зразумела, аб замацаванні маладых кадраў на вёсцы павінна балець галава і ў мясцовых улад, кіраўнікоў прамысловых і сельскіх прадпрыемстваў. Паводле слоў старшыні Лідскага райвыканкама, нярэдка яшчэ факты выкарыстання спецыялістаў на малакваліфікаваных работах, скажам, на прыбіранні камянёў з палеткаў. Сустракаюцца і іншыя хібы ў рабоце з моладдзю.

А там, дзе ўважліва ставяцца да працаўладкавання маладых і вырашэння іх бытавых пытанняў, адпаведны вынік. У знакамітым агракамбінаце «Сноў» у Нясвіжскім раёне школьная моладзь ад дабра дабра не шукае. Тут большасць маладых і ўжо немаладых спецыялістаў — мясцовыя жыхары. Працоўныя дынастыі — з'ява звыклая. Што прываблівае моладзь? Стабільная работа, дастойная зарплата, перспектывы кар'ернага росту, выдатныя ўмовы для актыўнага адпачынку, заняткаў спортам як на стадыёне, так і ў зімовым басейне. Навошта ж ехаць адсюль?

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ДЗЕЛЯ ЗДАРОЎЯ!

**На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзілі рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Здароўе і дэмаграфічная бяспека» на 2021—2025 гады.**

Вядома, што менавіта Падзвінскі край першы прыняў выклік каранавіруснай інфекцыі. І адпаведная сістэма: выяўлення інфіцыраваных, ізаляцыі, лячэння — не дала збояў. У выніку вобласць дастойна справілася з першай хваляй эпідэміі раней невядомай хваробы. І вопыт, які напрацавалі медыкі на поўначы краіны, потым выкарыстоўваўся ў іншых абласцях і Мінску.

Прытым, што барацьба з «інфекцыяй XXI стагоддзя» працягваецца, не спыняецца і працэс павышэння якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва ў цэлым.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя аблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ** расказаў пра маштабную рэканструкцыю аб'ектаў аховы здароўя і акрэсліў планы далейшых дзеянняў.

У прыватнасці, каб падцягнуць узровень мясцовай медыцыны да абласной, робіцца стаўка на стварэнне і развіццё міжраённых медыцынскіх цэнтраў.

Шмат увагі такім установам, якія ўжо працуюць у буйных гарадах Падзвіння: Оршы, Полацку і Наваполацку. З часам яны па тэхнічнай «начынцы» не будуць саступаць клінікам, якія знаходзяцца ў абласным цэнтры. Але трэба, каб было каму працаваць на абсталяванні, якое адпавядае сучасным стандартам. Таму асобная размова пра тое, як захоўваць і прывабліваць маладыя кадры.

Наконт унікальнага вопыту. Сёлета пачалі прымаць пацыентаў у першым для вобласці міжраённым скрынінгавым цэнтры па выяўленні анкалагічных захворванняў. Ён функцыянуе на базе Аршанскай цэнтральнай паліклінікі. Сюды па кансультацыі і абследаванне могуць звяртацца і жыхары суседніх Дубровенскага і Талачынскага раёнаў. Біялагічныя матэрыялы накіроўваюцца ў Віцебскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер і сталічны Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава. Такая магчымасць дазваляе жыхарам глыбінкі сэканоміць час і атрымаць пры гэтым якасны медыцынскі сэрвіс.

Таксама сёлета запрацаваў міжраённы цэнтр трамбалітычнай тэрапіі (для нармалізацыі кровазвароту, у тым ліку для прафілактыкі інфаркту), які дзейнічае на базе Браслаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

У вобласці, каб павысіць эфектыўнасць функцыянавання службы хуткай медыцынскай дапамогі, ажыццяўляецца яе цэнтралізацыя. У прыватнасці, да пачатку ліпеня да Віцебскай гарадской «103» запланавалі далучыць брыгады суседніх раёнаў: Лёзненскага, Сенненскага, Шумілінскага, Бешанковіцкага і Гарадоцкага. Ад гэтага выйграюць і медыкі, і патэнцыйныя пацыенты. Будзе палепшана матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Напрыклад, у ліку іншага людзі ў белых халатах атрымаюць каля пятнаццаці новенькіх аўто.

Каб палепшыць першаснае медыцынскае абслугоўванне, сэканоміць бюджэтныя сродкі, акцэнт робіцца на дзейнасць урачоў агульнай практыкі. Сёлета запланавана, што такія спецыялісты будуць абслугоўваць ужо каля 40 % жыхароў вобласці. Там, дзе такія дактары ёсць, становіцца менш праблем са здароўем у грамадзян, прыпісаных да тэрапеўтычных участкаў. У прыватнасці, своечасовае назіранне дазваляе паніжаць колькасць шпіталізаваных з хранічнымі захворваннямі, на больш ранніх стадыях можна выявіць анкалагічныя захворванні, цукровы дыябет, праблемы з сасудамі і іншае.

Кіраўнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя запэўніў народных выбраннікаў, што ўсе рэгіянальныя змены праводзяцца толькі дзеля атрымання станоўчага выніку з улікам патрэб часу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

РАЗВІЦЦЁ І ПЛАНЫ СТАЛІЦЫ

## Фудкорты, джаз-клуб і школа беларускіх майстроў

**Якія работы па рэканструкцыі і аднаўленні гістарычнага цэнтра сталіцы праводзяцца зараз, расказаў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме Аляксандр КОХАН, дырэктар КУП «Мінская спадчына».**

Як паведамляе Тэлеграм-канал «Мінск. Афіцыйна», будаўніцтва арэнднага дома ў Ракаўскім прадмесці плануюць распачаць у маі. На яго ўжо ёсць праектная дакументацыя, якая прайшла экспертызу. Гэты арэндны дом будзе цалкам адрозніваецца ад дзяржаўнага арэнднага жылля, якое прапаноўваецца гараджанам. У прыватнасці, кватэры тут будуць здавацца з аздабленнем, мэбляй, бытавой тэхнікай і па рынкавым кошце.

Рэканструкцыю тэрыторыі былога хлебазавода ў Ракаўскім прадмесці плануюць завяршыць у 2023 годзе. Тут, на тэрыторыі былога хлебазавода № 1, рэканструююць 15 будынкаў — гэта каля паловы прадмесця. У эксплуатацыю ўжо ўведзены тры аб'екты агульнай плошчай 8,5 тысячы «квадратаў». У былым галоўным корпусе хлебазавода функцыянуе міні-пякарня з дэманстрацыйнай выпечкай хлеба. Падобны аб'ект адкрыецца і ў будынку № 2 галоўнага вытворчага корпуса, што забяспечыць пераемнасць гістарычных функцый гэтай тэрыторыі. У будынку № 1 працуе адукацыйны цэнтр, у будынку № 3, які цалкам пабудаваны за кошт інвестара, адкрыюцца медыцынскі цэнтр і кафэ беларускай кухні. Прапрацоўваецца пытанне выкарыстання фестывальнай плошчы — месца ўнутры квартала, якое плануюць задзейнічаць для арганізацыі фудкортаў і фанзон.

Яшчэ чатыры будынкі знаходзяцца ў стадыі будаўніча-мантажных работ. Так, у будынку № 11 за кошт сродкаў інвестара плануюць адкрыць джазавы клуб. Аб'ект стане ўнікальнай пляцоўкай у Мінску для выступлення джазавых калектываў. У будынку № 12, у рэканструкцыі якога прыме ўдзел будучы арандатар, адкрыюць гандлёва-рамесны пасаж і школу беларускіх майстроў, дзе можна будзе павучыцца ганчарнаму мастацтву, саломапляценню і іншым нацыянальным рамёствам.

Забудову тэрыторыі хлебазавода плануюць завяршыць у 2023 годзе. Аднак частка Ракаўскага прадмесця пакуль не ахоплена рэканструкцыяй, хоць там ёсць аб'екты і тэрыторыі, што патрабуюць прыкладання намаганняў. Гэта квартал вуліц Шпалернай, Вызвалення і Замкавай. Цяпер распрацоўваюць канцэпцыю з магчымасцю стварэння забудовы за кошт сродкаў інвестараў і прывядзення гэтай тэрыторыі ў парадак па аналогіі з тэрыторыяй хлебазавода.

Што датычыцца планаў у адносінах да кінатэатра «Перамога», то яго пачнуць рэканструяваць сёлета ў трэцім квартале. Ён стане трохзальным кінатэатрам. Будуць адрэстаўрыраваны і захаваны дэкаратыўныя элементы як унутранага аздаблення, так і фасада будынка, плануецца выканаць цікавую архітэктурную падсветку. Праект прайшоў неабходныя ўзгадненні, зараз рыхтуецца да праходжання дзяржаўнай экспертызы праектна-каштарыснай дакументацыі.

Пасля рэканструкцыі «Перамога» застанецца ў камунальнай уласнасці горада. Абавязковая ўмова яго арэнды — захаванне функцыі кінатэатра.

# ДЗЕ ДОМ СТАЯЎ — РАСЦЕ КУКУРУЗА




### У Сухопальскім сельсавеце кожны год зносіцца паўтара дзясятка дамоў

**У склад Сухопальскага сельсавета ўваходзяць 28 населеных пунктаў. Па стане на пачатак гэтага года ў 923 вясковых хатах ніхто не жыве. Больш за тры гады пустуюць 210 дамоў. Работы ў плане скарачэння колькасці пустых і старых дамоў у выканкаме хапае. Напрыклад, летась знеслі 14 старых і трухлявых дамоў, з пачатку гэтага года вызваліліся ўжо чатыры пляцы пад былымі пабудовамі і сядзібамі.**

### Пошукі, суды, перапіска

Тэрыторыя адміністрацыйнай адзінкі даволі вялікая. Тут размяшчаюцца землі трох гаспадарак: ААТ «Мурава», ААТ «Роўбіцкае», вытворчы ўчастак ААТ «Жураўлінае». І хоць побач з Сухопалем, Роўбіцкам, іншымі населенымі пунктамі праходзіць аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы, тутэйшая нерухомасць асаблівым попытам не карыстаецца. У асобных вёсках дамы аддаюць па паўтары—дзве тысячы долараў у эквіваленце, але пакупнікі ў чэргі выстройваюцца. На рыначны кошт уплывае аддаленасць ад буйных гарадоў.

Варта адзначыць, што вялікая колькасць дамоў падтрымліваецца ў адносным парадку нашчадкамі былых гаспадароў і выкарыстоўваецца ў летні перыяд для адпачынку ці агародніцтва. Але даволі многа такіх, якія з гадамі пачынаюць разбурацца, прыходзяць у занепад і становяцца клопатам мясцовай улады.

> Старшыня сельвыканкама Міхаіл Мартынаў лічыць вельмі патрэбным указ, падпісаны ў канцы сакавіка, які датычыцца ўдасканалення работы з пустымі дамамі ў сельскай мясцовасці. Цяпер будзе працей надаць новае жыццё многім вясковым дамам.

**Старшыня Сухопальскага сельскага Савета Міхаіл МАРТЫНАЎ** гаворыць, што знайсці магчымых нашчадкаў часта становіцца задачай вельмі складанай:

— Накіроўваем запыты ў розныя інстанцыі. Пры гэтым яшчэ трэба ведаць, кампетэнтныя ўстановы якой краіны давядзецца турбаваць. Раней моладзь, як вядома, раз'язджалася па ўсёй былой вялікай краіне. Цяпер дзеці і ўнукі ўласнікаў дамоў жывуць у розных кутках блізкага, а часам і далёкага замежжа. Таму здараецца, што найлепшай крыніцай інфармацыі становяцца вясковыя старажылы. Ну, а знайшоўшы нашчадкаў, адразу ладзім перапіску. Часам у ёй і вырашаецца лёс будынка. Бо патэнцыяльны ўласнік, бывае, лічыць за лепшае пісьмова адмовіцца ад пабудовы і тым самым пазбегнуць дадатковых праблем.



**Старшыня сельскага Савета Міхаіл МАРТЫНАЎ на полі, якое ўтварылася пасля зносу дамоў.**

Некаторыя спадчыннікі самі разбіраюць былыя дзедаўскія дамы, іншы раз знаходзяць магчымасць прадаць пабудовы юрыдычнай асобе пад знос на дровы. Але найбольш старых дамоў ідзе пад знос пасля адпаведнага рашэння суда. Сельвыканкам накіроўвае дакументы ў суд з просьбай прызнаць дом безгаспадарчым. Пасля шэрагу неабходных юрыдычных фармальнасцяў такое рашэнне прымаецца, і дом пераходзіць ва ўласнасць мясцовага органа ўлады.

### Зямля — у севазварот

Менавіта з прымяненнем вышэйапісанай працэдуры былі знесены тры жылыя дамы ў вёсцы Грыневічы. Туды і накіроўваемся са старшынёй сельскага Савета Міхаілам Мартынавым. «Усе выдаткі па ліквідацыі былых пабудоў узяло на сябе сельгаспрадпрыемства «Мурава» — расказвае Міхаіл Яўгенавіч. Самі каробкі дамоў разабралі яшчэ зімой. З надыходам вясны пляцоўку канчаткова расчысцілі, правялі рэкультывацыю зямлі, падрыхтавалі глебу і пасеялі кукурузу. Такім чынам, у севазварот гаспадаркі ўведзены ладны кавалак зямлі.

Дамы пад нумарамі 9, 11, 13 стаялі на адной вуліцы адзін за адным. Таму вызваліўся ўчастак зямлі, які можна апрацоўваць любой габарытнай тэхнікай. А гэта для гаспадаркі выгадна. У пачатку вуліцы застаўся адзін дом, які таксама мае не вельмі прывабны выгляд. З яго гаспадарамі зараз вядуцца перамовы.

— Справа ў тым, што ёсць законная гаспадыня гэтага дома. Хоць яна жыве ў дзяцей ужо добры дзясятак гадоў, але пакуль не дае згоду на знос пабудовы. Яно і зразумела, — разважае кіраўнік мясцовай улады. — Мы не можам прыспешваць у такім выпадку. Добра разумеем, як некалі ўзводзілі дамы вясковыя жыхары, як у многім сабе адмаўлялі пры гэтым. А цяпер пусціць сваю былую хаціну пад бульдозер, у якім бы стане яна ні была, не кожны адважыцца. Таму і чакаем. Хоць падчас апошняй тэлефоннай гутаркі пенсіянерка сказала, што неўзабаве дзеці збяруцца, і на сямейнай нарадзе будуць вырашаць пытанне пра лёс гэтай хаты. Можа, захочуць аднавіць бацькоўскую сядзібу. Іх права, толькі давядзецца рукі прыкласці.

### Каб у Хвалаве хаты хвалілі

Так і хацелася заклікаць асобных нашчадкаў жылых дамоў з вёскі Хвалава прыкласці рукі да дома, дзе, скажам, пакасілася, а ў асобных месцах і зусім абвалілася агароджа. Пры гэтым сам дом выглядае цалкам нармальна: прасторны, з вялікімі вокнамі, узведзены, як тут кажуць, з пушчанскай драўніны. Магчыма, спадчыннікі жывуць недзе далёка. Бывае і такое.

Хвалава — даволі вялікая вёска. Некалі была трэцяя сярод сельскіх населеных пунктаў былога Шарашоўскага раёна па колькасці жыхароў. Цяпер палова, калі не больш, дамоў пустыя. У вёсцы зачынілі апошні аб'ект інфраструктуры — магазін. Праўда, некаторыя нашчадкі падтрымліваюць хаты ў належным стане, гэта адразу заўважна. Ёсць і такія дамы, што ў чарзе на знос.

Як бы ні было шкада, а зносіць старыя дамы даводзіцца. І работа гэтая не танная. Вядома, тых грошай, што выдзяляюцца з бюджэту, не хапае, асабліва калі гаворка ідзе пра такі сельсавет, як Сухопальскі, дзе колькасць пустых дамоў параўнальная з іх колькасцю ва ўсім, напрыклад, Клецкім раёне. Таму мясцовая ўлада выйсце бачыць у супрацоўніцтве з сельгасарганізацыямі. Паводле слоў старшыні сельскага Савета, асабліва плённай атрымліваецца сумесная работа з ААТ «Мурава». У кіраўніцтва гаспадаркі ёсць свая тактыка работы з такімі дамамі. Лепшыя з іх, найперш на цэнтральнай сядзібе, сельгаспрадпрыемства купляе, праводзіць рэканструкцыю і выдзяляе сваім работнікам, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Ну а тыя, што размешчаны ў населеных пунктах без інфраструктуры і выразных перспектыў, зносяць, а ўчасткі ўводзяць у севазварот. Вядуць гэтую работу і іншыя сельгаспрадпрыемствы. Драўніну выкарыстоўваюць для ўласных кацельных на цвёрдым паліве.

Сёлета па сельсавеце запланавана знесці 16 дамоў. Старшыня сельвыканкама Міхаіл Мартынаў лічыць вельмі патрэбным указ, падпісаны ў канцы сакавіка, які датычыцца ўдасканалення работы з пустымі дамамі ў сельскай мясцовасці. Цяпер будзе працей надаць новае жыццё многім вясковым будынкам. Бо зносяцца толькі тыя з іх, якія не маюць ніякай перспектывы ды псуюць знешні выгляд населеных пунктаў. Калі трухлявых збудаванняў стане менш, вёска будзе выглядаць больш прывабна, тады хутчэй знойдуцца ахвотныя набыць домік, які можна прывесці ў парадак і скарыстаць сабе на радасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**
*Пружанскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 29 красавіка 2021 года.**

Як гэта было

# «Пераканаўча прашу зрабіць мне ласку і выдаць пісталет», —

## з такой просьбай звярнуўся святар да камандзіра партызанскага злучэння

**ВЯЛІКАЯ Айчынная вайна змяніла стаўленне да праваслаўнай царквы не толькі з боку савецкага ўрада, але нават і з боку Сталіна. Гэта было выклікана, па-першае, патрыятычнай пазіцыяй, занятай кіраўніцтвам Рускай праваслаўнай царквы ў дачыненні да раптоўнага ўварвання фашысцкіх войскаў на тэрыторыю Савецкага Саюза. Па-другое, перапіс насельніцтва 1937 года паказаў: нягледзячы на актыўную палітыку, якую праводзіла бальшавіцкая партыя супраць царквы, амаль усё насельніцтва краіны адкрыта заявіла аб сваёй рэлігійнасці. Па-трэцяе, ва ўсенароднай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўзялі актыўны ўдзел як самі служыцелі рэлігійных культаў, так і мільёны вернікаў.**

На акупаванай тэрыторыі Беларусі гітлераўскія ідэолагі спрабавалі выкарыстаць рэлігійны фактар для ўзмацнення варожасці да бальшавізму, драблення рэлігійнага руху і недапушчэння яго кансалідацыі для дапамогі нямецкай адміністрацыі.

Але многія святары падзялілі долю свайго народа. Яны вялі прапаведзі, накіраваныя на непрызнанне чужаземцаў, заклікалі прыхаджан маліцца за доблесных братоў і сясцёр, якія не змірыліся з новай уладай. Многія служыцелі царквы сталі агентамі, партызанскімі сувязнымі і нават партызанамі.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца дакументы, якія пацвярджаюць патрыятычныя дзеянні царкоўных служыцеляў, іх імкненне дапамагаць партызанам і выхаваўчае ўздзеянне на прыхаджан.

26 кастрычніка 1943 года сакратар ЦК КП(б)Б Аўхімовіч, пабываўшы ў тыле праціўніка, пісьмова паведамляў першаму сакратару ЦК Беларускай ССР П. К. Панамарэнку аб гутарцы са свяшчэннікам Кашэвіцкай царквы Капаткевіцкага раёна Палескай вобласці (цяпер Петрыкаўскі раён Гомельскай вобласці) Рыгорам Чаусам. У ходзе гутаркі свяшчэннік расказаў, што сваю работу ён праводзіць «у поўнай увязцы з партызанамі», і паведаміў такія дэталі: «Да мяне прыходзіць адзін партызанскі камісар, прагледзеў змест маіх пропаведзяў, сёе-тое закрэсліў, сёе-тое дадаў, і вось я гэтага і прытрымліваюся. Мы ў сваіх малітвах молімся за перамогу нашай зброі, здароўе партызан і ў дадзеным выпадку за здароўе Героя Савецкага Саюза, камандзіра партызанскага атрада Фёдара Паўлоўскага, бо дзякуючы яго атраду наша вёска ўвесь час знаходзіцца пад ахавай партызан і засталася цэлая».

І яшчэ паведаміў Рыгор Чаус, што кожную нядзелю ён збірае ў прыхаджан для партызанскага шпіталя яйкі, масла, іншыя прадукты, а таксама перавязачны матэрыял для параненых.

У партызанскай брыгадзе імя Леніна Пінскай вобласці знаходзіўся ўраджэнец вёскі Пунічы Францішак Купш, які перад вайной служыў ксяндзом у мясцовым касцёле. Па заданні камандавання брыгады Купш збіраў звесткі аб злачынствах, учыненых нямецкімі захопнікамі ў Ленінскім (цяпер Жыткавіцкім) раёне. У чэрвені 1943 года ён быў адпраўлены самалётам у савецкі тыл, дзе і паведаміў Беларускаму штабу партызанскага руху сабраныя ім звесткі аб зверствах акупантаў.

У сакавіку 1943 года з пісьмом да вернікаў звярнуўся кіеўскі мітрапаліт Мікалай. У звароце выказваўся боль за шматпакутную зямлю, акупаваную фашыстамі, а таксама ўпэўненасць у перамозе Чырвонай Арміі над праклятым ворагам, гучаў заклік да ўсіх праваслаўных прыхаджан садзейнічаць партызанам: «Святая царква радуецца, што сярод вас на святую справу выратавання Радзімы ад ворага паўстаюць народныя героі, слаўныя партызаны, для якіх няма вышэйшага шчасця, як змагацца за Радзіму, а калі трэба — памерці за яе. Будзьце сапраўднымі хрысціянамі, ратуйце вашу святую маці-царкву праваслаўную на карысць вызвалення нашай радзімы ад фашысцкіх захопнікаў, а яна ніколі не пакіне вас».

Гэты заклік украінскай праваслаўнай царквы разам са зваротамі і заклікамі падпольных райкамаў і абкамаў партыі ў выглядзе лістовак распаўсюджваўся сярод насельніцтва і знаходзіў жывы водгук у сэрцах людзей.



Царкоўныя служыцелі лепш за іншых ведалі не толькі сваіх прыхаджан, але і становішча ў населеных пунктах прыхода, ведалі аб настроі насельніцтва ў дачыненні да акупантаў. Менавіта таму партызанскія камандзіры выкарыстоўвалі царкоўных служыцеляў у якасці сваіх агентаў і сувязных.

Прыкладам патрыятызму, аддانасці роднай Айчыне быў свяшчэннік Мала-Плотніцкага прыхода Лагішынскага (цяпер Пінскага) раёна Аляксандр Фёдаравіч Раманушка. Святар актыўна ўключыўся ў барацьбу з нямецкімі акупантамі ў 1942 годзе, з'яўляўся сувязным партызанскага атрада імя Арджанікідзэ. Падазраваўся ў сувязях з партызанамі, за што падвяргаўся ганенню з боку нямецкіх улад, а ў лістападзе 1943 года разам з сям'ёй прыйшоў у штаб партызанскай брыгады імя Куйбышава. Святы айцец, як Раманушку называлі партызаны, праводзіў вялікую выхаваўчую работу сярод байцоў брыгады і мясцовага насельніцтва, заклікаў сялян да барацьбы з акупантамі. У прадстаўленні да ўзнагароджвання Аляксандра Раманушкі гаворыцца: «Бездакорны патрыёт сваёй Радзімы».

11 лютага 1944 года Раманушка звярнуўся з пісьмом да камандзіра Пінскага партызанскага злучэння В. Каржа з просьбай забяспечыць яго і сына зброяй. Вось як тлумачыць святар гэту просьбу:

«Згодна з работай, даручанай мне камандаваннем брыгады, я ўвесь час раз'язджаю па населеных пунктах Лагішынскага і Целяханскага раёнаў і заклікаю насельніцтва да аказання дапамогі партызанам і ўступлення ў атрады для барацьбы з захопнікамі. Хоць наша камандаванне заўсёды накіроўвае са мной для аховы двух байцоў, аднак не выключана магчымасць, што ў адзін момант мы можам быць раздзелены і я акажуся зусім безабаронным перад ворагам.

У гэтай сувязі, калі ў вас або ў вашым распараджэнні маюцца свабодныя пісталеты сістэмы «ТТ», пераканаўча прашу не адмовіць зрабіць мне ласку і пры першым зручным выпадку перасланць яго на імя камандзіра брыгады т. Антановіча, а для сына — вінтоўку-дзесяцізарадку».

У канцы пісьма святар абяцаў «і надалей разам з народам і яго найлепшымі сынамі-партызанамі змагацца з гэтымі вылюдкамі роду чалавечага да канчатковага разгрому фашызму».

Невыпадкова партызанская барацьба на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўвайшла ў гісторыю як усенародная. У ёй удзельнічалі ваеннаслужачыя Чырвонай Арміі, якія па волі лёсу апынуліся ў тыле праціўніка, дарослае насельніцтва гарадоў і вёсак, старыя і дзеці. У адзіным страі з гэтымі змагарамі былі і прадстаўнікі царквы.

**Генадзь БАРКУН,**
**гісторык.**




*Тут мільярды планет*
*спалі ў зорных туманах*
*І мільярды стагоддзяў*
*ішлі след у след...*
*Так бы ўсё й засталося,*
*але нечакана*
*На Зямлі з-пад снягоў*
*узышоў першацвет.*

*З тых часоў незабыўных*
*на нашай планеце*
*Мірачочыць па вёснах*
*бярозавы сок,*
*Ўваскрасае жыццё*
*ў маладым першацвеце,*
*Прад святлом велікодным*
*разыходзіцца змрок.*

Надвор'е

# Май стартуе сапраўдным цяплом

### Вось толькі ўначы каля нуля, а месцамі — невялікі мінус

**Сёння ў нашу краіну пачала паступаць больш цёплая паветраная маса, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У першы дзень мая будзе даволі сонечна. Менавіта ў суботу з поўначы Польшчы чакаецца распаўсюджванне вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі ўначы па ўсходзе краіны яшчэ захаваецца ўплыў атмасферных франтоў. Будзе пераважна без ападкаў, ноччу месцамі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, удзень — 10—17 цяпла.

Досыць цёплае, але дажджлівае надвор'е чакаецца і 2 мая. Такім чынам, у нядзелю ўначы ў паўднёвых раёнах, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў, звязаных з паўднёвым цыклонам, які ссоўваецца з поўначы Італіі на паўднёвы ўсход Польшчы. Уначы па поўдні, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы. У дзённыя гадзіны ў паўднёвых раёнах месцамі навальніцы. Вецер прагназуецца заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса па поўначы да плюс 7 па поўдні. Удзень будзе 9—16 цяпла, у паўднёвых раёнах — да плюс 18 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, наступны тыдзень пачнецца з дажджлівага і ветранага надвор'я. У панядзелак захаваецца ўплыў паўднёвага цыклону, які ссоўваецца праз нашу краіну на Смаленскую вобласць Расіі. У многіх раёнах нашага рэгіёна чакаюцца дажджы, узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 градусаў вышэй за нуль, удзень — 7—14 цяпла. Па паўднёвым усходзе: уначы — плюс 11—12 градусаў, удзень — 15—17 градусаў са знакам плюс. І на гэтым добрыя навіны заканчваюцца.

У пачатку мая часам штарміць. У аўторак зноў пахаладае, пад уплывам няўстойлівай паветранай масы, якая паступае да нас з поўдня Балтыкі, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя гадзіны ў асобных раёнах захаваецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень таксама не горача — 6—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1**. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163118 площадью 303,5 кв. м, наименование – бытовые помещения, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11а. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена:** 20 265,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2026,50 бел. руб.

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163116 площадью 584,6 кв.м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/ 19-11б. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена**: 37 793,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 3 779,30 бел. руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163119 площадью 555,1 кв. м, наименование – бытовые помещения, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена**: 36 448,50 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 3 644,85 бел. руб.

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163107 площадью 330,4 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена**: 22 042,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 204,20 бел. руб.

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163111 площадью 265,5 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16в. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена**: 17 864,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1786,40 бел. руб.

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109 площадью 142,3 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. Наличие мест общего пользования. **Нач. цена:** 9748,50 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 974,85 бел. руб.

**Лот № 7.** Капитальное строение с инв. № 200/C-86464, объем – 288 куб. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, резервуар вблизи здания № 81/30, наименование – резервуар, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628 площадью 13,5154 га (общая долевая аренда) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81.

**Нач. цена:** 6 339,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 633,90 бел. руб.

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-187182 площадью 936,4 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-28. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена:** 25 519,26 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 551,92 бел. руб.

**Условие аукциона по лоту № 8:** покупатель обязуется обустроить в изолированное помещение отдельный вход.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 19.05.2021 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 30.04.2021 с 08.30 по 19.05.2021 до 10.00. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 28.11.2020, 16.03.2021.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Условия повторного аукциона**: победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона и возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта**.** По договоренности с Продавцом возможно предоставление рассрочки оплаты предмета торгов на срок до шести месяцев. **Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 6114046, Труханович Александр Владимирович.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 13 мая 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8

| Предмет торгов № 1 |
|---|
| Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786223 общей площадью 156,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-20 (наименование: помещение общественного питания, назначение: помещение общественного питания); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786222 общей площадью 53,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-19 (наименование: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, назначение: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения); изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786220 общей площадью 12,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лейтенанта Кижеватова, 8-17 (наименование: помещение санитарно-бытового назначения, назначение: помещение санитарно-бытового назначения) |
| Начальная цена: 472 950,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 47 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», ул. Лукьяновича, 4-253, 220113, г. Минск, тел. (017) 388-43-55.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **13 мая 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 30.04.2021 по 12.05.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

Центр Промышленной Оценки

**• Организация аукционов**
**• Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец**: ЗАО «Горизонт-Белинвест-Девелопер», г. Минск, ул. Красная, д. 7, комн. 4, 220029

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

| № лота | Наименование предмета аукциона | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Здание магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания** общей площадью 664,4 кв. м, инв. номер 710/С-11693, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27. Составные части и принадлежности: мансарда, тамбур, два навеса. Обременение: аренда. Подробнее на сайте организатора аукциона | **501 296,04 бел. руб.** |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 0,1101 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания | |
| 2 | **Здание производственно-бытового корпуса** общей площадью 3 695 кв. м, инв. номер 710/С-2712, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 170 | **358 068,60 бел. руб.** |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 0,9864 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения | |
| 3 | **Здание гостиницы** общей площадью 1155,2 кв. м, инв. номер 710/U-3619, по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, около д. Сычково | **197 716,14 бел. руб.** |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 0,2796 га предоставлен на праве аренды (по 25.04.2027) для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного здания гостиницы | |

**Обременения по лотам №№ 1–3: залог в ОАО Банк Развития Республики Беларусь**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY77 BLBB 3012 0191 4380 2600 1001 в ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, БИК BLBBBY2X. **Получатель платежа:** ЗАО «Горизонт-Белинвест-Девелопер», УНП 191438026

**Срок подписания договора купли-продажи**: **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов 10.00 31.05.2021 г.**
**Окончание торгов 12.00 31.05.2021 г.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**: **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.05.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны**: **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ ПРАВА НА ЗАГОТОВКУ И (ИЛИ) ЗАКУПКУ ДИКИХ ЖИВОТНЫХ, НЕ ОТНОСЯЩИХСЯ К ОБЪЕКТАМ ОХОТЫ И РЫБОЛОВСТВА, ВИНОГРАДНОЙ УЛИТКИ (HELIX POMATIA) НА ТЕРРИТОРИИ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

| Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|
| Право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Чашникского района Витебской области | В соответствии с заключением предоставленным Национальной академией наук Беларуси промысловый запас виноградной улитки составляет 35 895 кг, предельно допустимый объем изъятия составляет 26 921 кг | 1 450,00 | 725,00 |

ОРГАНИЗАТОР – Чашникский районный исполнительный комитет, 211149, Витебская область, г. Чашники, ул. Советская, 44, контактный телефон-факс в г. Чашники: 8 (02133) 41232, сайты: www.vitebsk-region.gov.by, www.chashniki.vitebsk-region.gov.by.

ПРОДАВЕЦ – Чашникский районный исполнительный комитет, 211149, Витебская область, г. Чашники, ул. Советская, 44, контактный телефон-факс в г. Чашники: 8 (02133) 41232.

1. **Аукцион состоится 31 мая 2021 г. в 15.00 в здании Чашникского районного исполнительного комитета по адресу: Витебская область, г. Чашники, ул. Советская, 44, каб. 37.**

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление, с указанием на какой территории и какие виды диких животных не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов.

3. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет;

- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

В торгах могут принимать участие представители юридического лица и индивидуального предпринимателя при условии представления надлежаще оформленной доверенности.

4. **Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, последний день приема документов 25.05.2021 до 17.00 по адресу: Витебская область, г. Чашники, ул. Советская, 44, каб. 31.**

Участник торгов имеет право до их начала письменно отозвать заявление об участии в торгах. При этом участнику торгов в течение пяти рабочих дней со дня обращения в комиссию по вопросу об отзыве заявления возвращается сумма внесенного им задатка.

Заключительная регистрация участников 31.05.2021 с 12.00 до 14.30. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет BY10 AKBB 3641 3290 0202 9220 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X. Получатель – Чашникский районный исполнительный комитет, УНП 300008503.

Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней.

Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

6. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

7. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 2: легковой автомобиль PEUGEOT 607, 2003 г. в. Начальная цена продажи лота – 3 240 руб. (три тысячи двести сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 324 руб. (триста двадцать четыре рубля)

Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 мая 2021 г. в 15.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.11.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 06 мая 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by**




## ЗАМУЖ ВЫЙСЦІ ТРЭБА ЗНАЦЬ...

### Пяць падушак рыхтаваць

Я, магчыма, і памыляюся, але ж скажу, што большасці з сённяшніх маладых дзяўчынства ўспамінаецца як свята: цацкі, прысмакі, можа, нават паездкі да мора... У сённяшніх пажылых (яшчэ мякка кажучы) усё было інакш.

Я вось з маленства працавала — пасвіла гусей, бо яны ў нас былі сухапутныя: паблізу ні рэчкі, ні канавы якой, ні хоць бы сажалкі. Адзін толькі выган, куды і сапраўды выганялі гусей, цялят, свіней. І пасвіць іх трэба было, бо з аднаго боку знаходзіліся людскія гароды, з другога — калгасныя палеткі з нейкай збажынай, да якой птушку ды скаціну цягнула як магнітам.

А я на пасьбу выходзіла з кніжкай. І адарвацца ад чытання ну ніяк не магла! Таму гусей і сваіх, і чужых пазабівала б, здаецца!

Бачачы гэта, дзядуля хіба ўсміхаўся ды неяк сказаў: «Бедная ты дзеўка. Доўга табе яшчэ мучыцца... Пакуль пяць падушак збярэш».

Я тады зусім не разумела: прычым тут падушкі?! І навошта аж пяць, калі досыць адной? Дзядуля параіў спытаць пра гэта ў таты.

І вось аднойчы восенню, калі наш выган добра такі апусцеў (гаспадыні сталі трымаць гусей на падворках, каб адкарміць на мяса), я, нарэшце, уздыхнула з палёгкай і папрасіла тату, каб расказаў мне пра пяць падушак. Ён крыху пасмяяўся, але ж узяўся ўспамінаць:

«У свой час, — казаў, — гадоў, можа, сто таму, жыў у вёсцы дужа багаты гаспадар. У яго і пабудовы былі найлепшыя, і жыўнасці рознай шмат, і прыгажосць паўсюль: і ў хаце, і паблізу... А вось аўтарытэту пры тым — ну ніякага, бо вельмі ж ганарысты быў: без фігі не да носа, як той казаў, людзей за людзей не лічыў...

І была ў яго дачка — Ганначка. Самы час бы дзеўцы замуж ісці, аднак бацька сказаў, што дастойных жаніхоў паблізу не бачыць, а за галадранца нават не падумае аддаваць...

Хоць адзін з такіх Ганне і падабаўся: прыгожы быў, разумны, майстравы... Уся ганьба, што ўдовін сын, што хатка старая-малая ды гаспадаркі амаль ніякай. Па гэтай прычыне Іван і ў сваты не ішоў.

А вось нейкі іншы жаніх, з далёкай вёскі, да Ганны з'явіўся.

Іван пачуў гэту навіну — і ў роспач: трэба ж, як быццам, нешта рабіць, а што? Дарослых сватоў яму naрад ці знайсці (да ганарлівца Дзеркача ніхто лішні раз не пойдзе), — кінуўся тады да сваіх сяброў. Дамовіўся з адным, з другім (маім будучым татам), і таксама да Ганны (у вёсцы лічылася, чым больш у дзеўкі сватоў, тым больш пашаны).

І вось яны ўтрох з бутэлькай гарэлкі заходзяць у хату, гавораць, чаго прыйшлі. Дзяркач той слухае ды ў вочы смяецца, думае, як бы і сваіх гасцей пасмяшыць — сватоў, што прыехалі першымі.

Для гэтага выцягвае з запечка дзве калодкі, абодвум жаніхам дае па сякеры — гаворыць, каб паказалі, ці ўмеюць секчы лучыну.

Той першы хлопец, багаты, за справу смела ўзяўся: акуратна так махаў сякерай, тое, што адсякаў, адразу ж складаў у кучкі...

Іванка спярша хіба глядзеў на ўсё — на багаты стол, на важных гасцей, на ганарыстага Дзеркача, — спрабаваў зразумець, якую ж той абразу для яго прыдумаў?..

А таму і справу пачаў спакваля: спакойна рассек калодку на некалькі вялікіх кавалкаў, паставіў у кут сякеру, сабраў на руку цурбакі.

— Хоць я бядняк, сірата, але прыніжаць сябе нікому не дазволю.

Сказаў ён так і... па вокнах — паленнем...

Шыбы звіняць, шкло сыплецца, усе аслупянелі...

Першым гаспадар апомніўся: схапіў качаргу і з крыкам «Ах ты, паганец!» кінуўся да нас, да Івана. А таго ўжо і след прастыў.

Трэба сказаць, што гэтае сватаўство адбывалася ўзімку, што на вуліцы былі маразы: холад адразу ж палез у хату, а зашкліць усе пяць акон тады цяжкавата было нават багатаму Дзеркачу: дзіркі прыйшлося затыкаць падушкамі.

...Ганначку, як і варта было чакаць, засваталі тыя прыезджыя — забралі замуж у іншую вёску. А ў сваёй — дзяўчатам яшчэ доўга казалі, што падушак трэба мець шмат: столькі, колькі вокнаў у бацькавай хаце, бо ці мала што... Гісторыі ж паўтараюцца».

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## ДОБРАЯ... ХВАРОБА

Нашы вяскоўцы, відаць, спрадвеку шмат працавалі, часу не мелі звяртацца да ўрачоў. Бо гэта ж, як правіла, некуды ехаць, некага непакоіць... Ім працей было думаць, што пабаліць ды перастане. А калі не — то гэткі ўжо лёс...

Дык вось два дні з жыцця жанчын.

Першы — зусім звычайны. Раніцой у брыгадны домік сышліся паляводы. Сядзяць там, чакаюць брыгадзіра, які зараз павінен прыехаць з нарады ў старшыні, размеркаваць іх па работах. А пакуль што могуць адпачыць, пагутарыць.

У той раз нейкай агульнай тэмы ў іх чамусьці не было: жанчыны перамаўляліся паміж сабой. Адна расказвала сваёй прыяцельцы, што ўчора госць у хаце быў, родны брат прыязджаў, але ж бедны, як сам не свой... Жонка ў яго захварэла: з кожным тыднем ёй горай і горай, а да ўрачоў не ідзе... Вось ён, маўляў, і рыхтуецца ўжо да самага найгоршага. Шкада чалавека! І жонку яго... Кабеце ж толькі 40 гадоў... Амаль 20 разам пражылі ў згодзе і ладзе... Праўда, дзетак ім Бог не даў.

Жанчыны пагаварылі так, паспачувалі, згадалі нешта сваё, а тут і брыгадзір прыехаў.

...Месяцаў праз колькі — дзень другі.

Такая ж раніца... Тыя ж людзі ў тым самым брыгадным дамку, з якога ні з таго ні з сяго... рогат — звонкі, нястрымны! Аж заходзяцца ўсе: і жанчыны, і мужчыны, і брыгадзір...

З чаго? Ды брат прыязджаў да той самай сястры. Прычым шчаслівы-шчаслівы! Сказаў, што жонка яго, тая хворая, сынка нарадзіла: Бог даў — не інакш!.. Багданам назвалі.

**Іван Букоўскі,**
*Глыбоцкі раён.*

## ТРЭБА МЫЦЬ НОГІ,

### альбо Размова нямога з глухім

Гэтыя два дзядзькі — назавём іх Вася і Гена — жылі ў раёне, а працавалі ў горадзе, у Рагачове, на заводзе «Дыяпраектар» (ці *дзіва*праектар, як кажуць у нас). Першы быў грузчыкам, другі — токарам-фрэзероўшчыкам... Што відаць было нават здалёк, у тым ліку — па іх гаспадарках. Тому Васю, напрыклад, хоць плот паставіць, хоць гарод узараць, хоць дроў нарыхтаваць, хоць дах накрыць — што раз плюнуць, як той казаў. А вось розныя там бабскія работы (падлогу памыць, пустазеліну вырваць) — гэта, прабачце, і божа барані! Так яго дзядуля вучыў, які, можа, цара яшчэ бачыў.

Гена — той іншы зусім: яму чамусьці і ў градах цікава, і адзежу памыць, і есці наварыць... Ён нават булкі пёк да Вялікадня! Сам замешваў, сам глядзеў, як падыходзяць, сам у печ садзіў... А калі чаго не ведаў альбо не ўмеў, у кніжках-газетах стараўся вычытаць, у людзей пытаўся...

Карацей, агульнага ў мужчын гэтых мала было, хіба што абодва, адзін перад адным, павыхваляцца любілі. Збярýцца, бывала, вып'юць і ўжо тады...

Не паверыце: кожны сам пра сябе расказвае-слухае, кожны сам сабой ганарыцца, і абодвум добра.

Дык вось, неяк раз яны пляшку ўзялі, у Гены свая закуска была. Вася як пакаштаваў яе, дык проста абалдзеў! Там такая смаката...

— Што гэта? — пытаецца ў Гены. — І дзе ты ўзяў?

Той з форсам:

— Ды індычына... Сам на*га*даваў, сам нага*та*ваў.

— Я... Я таксама нагадую! — загараўся Вася.

Гена пачаў быў яму даводзіць, што птушка гэта вельмі няпростая — далікатная ў доглядзе, але Вася і слухаць не стаў, бо тут жа вясна якраз, а значыць...

Гена чарговы раз пасадзіў на яйкі індычку, Вася купіў гатовых індычанят і ўзяўся іх гадаваць — прычым так, як ён разумеў: як куранятак-бройлераў.

Не ведаю, колькі там часу прайшло, — запыханы, прыбягае да Гены, кажа:

— Браток, падкажы, што рабіць? Учора адно птушаня захварэла, сёння — другое...

Гена яму:

— Паспрабуй падкурыць.

Вася:

— Дык я ж і так... Кожны дзень...

(Без цыгарэты ў зубах ён, і праўда, хіба ноччу бывае...)

— «Падкурыць» — гэта іншае... Гэта зёлкамі трэба, — павучае Гена і нават цэлую лекцыю «выдае» пра тое, чым птушанят карміць, што рабіць, каб у іх ні лішняй вільгаці, ні холаду, ні бруду... Каб цёпла, каб суха, каб чыста... Ногі, маўляў (гэта бабы сказалі б «лапкі» ці «ножкі»...) кожны дзень трэба мыць!

Адзін, карацей, загадаў, як думаў, другі зразумеў, як пачуў і тут жа пайшоў выконваць.

Дні са тры яго ў Гены не было, потым зноў з'явілася, прычым зноў з бядою: яшчэ дзве птушкі здохлі... А я ж, маўляў, і прыбіраў у іх, і пабяліў, і ногі мыў...

— Вадой? — удакладніў Гена.

— ?!

—... А зараз паспрабуй гарэлкай.

Вася (ён, вядома ж, пра свае ногі думаў) тут яшчэ раз знямеў.

— Як?.. — спытаўся ледзь чутна. — Гэта ж колькі яе спатрэбіцца?! Можа, з вядро?

— Прычым тут вядро? — запярэчыў Гена. — У кубачак наліў і мачай да каленцаў.

Вася з твару змяніўся: да яго дайшло (!), каму трэба ногі мыць, і ён зарагатаў.

З чаго зарагатаў, хутка зразумеў і Гена. Пасмяяліся разам.

...Так ці інакш, але некалькі індыкоў у Васіля да восені ўсё-ткі вырасла — ён выгадаваў... Адзінае — працэс гэтай гадоўлі не сказаць каб яму спадабаўся. З куранятамі куды працей было: пакарміў, і растуць сабе. І ніякіх зёлак ім, ніякіх пабелак ды гарэлкі, каб ногі мыць «да каленцаў».

...Гена, дарэчы, таксама індыкоў цяпер не гадуе, на падворку толькі парачка засталася: пакінуў, каб куранят вадзілі, бо, кажуць, што лепшых птушыных «матак» у свеце няма! Каршун, напрыклад, за вярсту аблятае, бо ведае: калі што, індычка на шматкі парве — не горш за сабаку.

...Вось такая выйшла гісторыя з-за таго, што адзін казаў, другі не разумеў (дакладней, разумеў не так)...

А калі б правільна, то і пісаць не было б чаго. Ну ўзяўся чалавек гадаваць індыкоў... Ну, з 10 выраслі тры. І ўсё — з чаго смяяцца? А так...

Так нават падумаць можна аб тым, як няпроста вяскоўцам даецца іхняе «ўсё сваё» — з хлява ды гарода.

Да таго ж, згадзіцеся, не такое яно і дармавое, калі ногі мыць трэба гарэлкай.

**С. Вароніна,**
*Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

---

Неасабісты суб'ектыў



# МОЦ ВЕРЫ

### Пра ролю асобы ў гісторыі. Нават калі гісторыя — зусім не «глабальная»

«Я называю Малыша сімвалам перамогі дабра над злом», — сказала ў тэлесюжэце яго выратавальніца. Гісторыя пра звычайнага дварняка сапраўды стала сёлета сімвалічна-велікоднай. Так, я пра таго самага Малыша, пра якога пісала тры тыдні таму. Якога адны людзі стукнулі па галаве і закапалі яшчэ жывым, а іншыя выцягнулі з магілы і выратавалі.

Сабачка павольна, але ўпэўнена ідзе на папраўку. Ён ужо стаў бачыць, упэўнена тупае пярэднімі лапамі, спрабуе на спецыяльных занятках перасоўваць заднія. (Ёсць надзея, што хутка пойдзе ўсімі чатырма, бо пазваночнік не пашкоджаны, але дае аб сабе знаць пяцідзённае нерухомае знаходжанне пад зямлёй.) Любіць паесці і нават пачаў звонка брахаць, «перагаворваючыся» са сваім хвастатым суседам у рэабілітацыйным цэнтры для жывёл. Карацей, гэтыя тры тыдні ў мяне асабіста добрыя навіны ёсць штодня. Прыйдзеш дадому стомлены, а часам і без настрою, адкрыеш групу ў вайберы — а там навіны пра Малыша: то ён спрабуе ўстаць, то з рэабілітолагам займаецца... Нават калі ваду з міскі заўзята-бадзёра хлёбае — і то на душы радасней. Асабліва таму, што ты да гэтай добрай справы хоць нейкай пералічанай капейчынай прычыніўся. Думаю, і тыя іншыя семсот шэсцьдзясят чалавек, што ўжо тры тыдні застаюцца ў агульным чаце, тое самае адчуваюць.

Гэта гісторыя сапраўды пра перамогу дабра над злом. Пра чалавечую спагаду. Але галоўнае (і з гэтага ўсё пачыналася, і гэта вельмі дарэчы зноў жа кладзецца на велікодную сімвалічнасць) — пра веру. Пра веру стваральную, якая натхняе на дзеянні нават у, здавалася б, безнадзейнай справе. Якая была напачатку толькі ў адной жанчыны. І з самага пачатку было зразумела, што менавіта дзякуючы яе веры і таму, што яна не сядзела склаўшы рукі, некалькі соцень іншых людзей, паміж сабой незнаёмых, магчыма, абсалютна розных палітычных поглядаў (а ў нашым грамадстве, на жаль, сёння гэта адзін з вызначальных паказальнікаў) аб'ядналіся дзеля адной добрай справы. Гэта яна першай прымчала ў Старобін і павезла пакалечаную жывёлу ў ветклініку. Гэта яна не дала ўсыпіць Малыша, як напачатку раілі ветэрынары, а пачала шукаць, дзе яго згодзяцца ратаваць. Гэта з яе падачы гісторыя старобінскіх (дагэтуль, дарэчы, не знойдзеных) нелюдзяў і іх ахвяры трапіла ў СМІ. Прычым яна не прасіла дапамагчы фінансава — толькі падстрахаваць у сталічнай ветклініцы. Хоць кожны, хто хоць раз вазіў да ўрача гадаванца, пацвердзіць: рахункі там нярэдка астранамічныя.

Я не ведаю гэтую жанчыну асабіста — толькі па відэа ды па перапісцы ў мэсэнджары. Адтуль і ведаю, што завуць яе Іна Курс і жыве яна ў Салігорску. Дапамагае не толькі бяздомным жывёлам, але і хворым на анкалогію дзеткам. Сваіх клопатаў і праблем у жанчыны хапае: сын-студэнт, хворая дачушка, пажылая мама ў вёсцы. Дома ў яе жывуць яшчэ восем кошак і сабака... Здавалася б, толькі круціся, выжывай, падай стомлена без сіл, скардзіся знаёмым і незнаёмым, як цяжка жыць. А яна... Яна імчыць ратаваць паўмёртвага бруднага дварняка, якога выкапалі з зямлі, вязе яго ў Мінск, шукае, хто возьмецца яго лячыць. А праз колькі дзён едзе да мамы ў вёску, ратаваць яшчэ адну жывую істоту — атручанага суседам сабаку, гэткага ж беспароднага, як Малыш. Вязе яго ў лякарню на сваёй машыне, пасля — да сябе дадому, бо больш няма куды...

Яна не маладая апантаная нейкай ідэяй дзяўчынка — дарослая жанчына са спакойнымі моцнымі рухамі і крыху стомленым тварам. Але ў вачах у яе — цёплае святло, а ўсмешка ненадумана шчаслівая. «Я называю Малыша сімвалам перамогі дабра над злом», — шчыра гаворыць яна карэспандэнту. Яна мае права так лічыць і так думаць.

А яно і сапраўды так атрымалася — добрая велікодная гісторыя. Прынамсі, амаль для васьмісот чалавек, большасць з якіх абсалютна паміж сабой незнаёмыя, якія, напэўна, маюць розныя палітычныя погляды і ўвогуле погляды на жыццё. Бо гэта не Малыш выжыў — гэта мы сталі больш жывымі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Организация:

## Общество с ограниченной ответственностью «Датч Стар»

Учетный номер плательщика: 191061436
Вид экономической деятельности: 68320
Организационно-правовая форма: хозяйственное общество
Орган управления: общее собрание участников
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, оф. 860

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 марта 2021 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 марта 2021 г. | На 31 декабря 2020 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 1 588 | 1 304 |
| амортизация | 102 | (345) | (542) |
| остаточная стоимость | 110 | 1 243 | 762 |
| из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования | 110а | - | - |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 14 | 14 |
| амортизация | 112 | (12) | (12) |
| остаточная стоимость | 120 | 2 | 2 |
| Доходные вложения в материальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | 1 434 | 1 608 |
| амортизация | 122 | (377) | (279) |
| остаточная стоимость | 130 | 1 208 | 1 329 |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 387 | 455 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | 821 | 874 |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 3 621 | 3 412 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 217 | 1 710 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **7 291** | **7 215** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
